Беларуская мова ў Беластоку ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Зберагчы спадчыну ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 25 (2667) Год LII Беласток, 24 чэрвеня 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

(Не)забытае Дубна

13 чэрвеня г.г. у Дубне адбылася прэзентацыя археалагічных раскопак колішняга двара Сапегаў. Прысутнічалі маршалак Падляшскага ваяводства Дарыюш Пянткоўскі, дырэктар Падляшскага музея Анджэй Ляхоўскі і войт Боцькаўскай гміны Станіслаў Дэрагайла ды археолагі і журналісты беластоцкіх медыяў.

Галіна Карвоўска з Падляшскага музея азнаёміла прысутных з гісторыяй мясцовага адгалінавання вялікага роду Сапегаў. Першая згадка пра Дубна паяўляецца ў 1506 годзе, калі кароль Аляксандр Ягайлавіч падарыў Дубна падляшскаму шляхцічу Ленарту Касінскаму. У 1512 годзе Іван Сямёнавіч Сапега некаторыя свае ўладанні памяняў з Касінскім на дубнянскі маёнтак. Годам пазней, актам ад 29 жніўня 1513 года, узнікае новае, Падляшскае ваяводства, а кароль Жыгімонт Стары назначае Івана Сапегу яго ваяводам. У той час у Дубне быў, мабыць, драўляны двор, а мураваны быў узведзены некалькі дзесяткаў гадоў пазней. Шведскае і маскоўскае нашэсці нанеслі Дубну значны ўрон і з таго часу пачынаецца паступовы заняпад двара. У канцы XIX ст. двор пусцее, яго рэшткі датрывалі яшчэ да міжваеннага перыяду, калі зніклі з паверхні зямлі. І толькі ў канцы XX стагоддзя на падставе архіўных ужо расследаванняў удалося правесці геалагічную разведку мясцовасці і выявіць прысутнасць рэштак двара ў зямлі. Раскопкі праводзіліся ў мінулым і бягучым гадах. Прымалі ў іх удзел навуковыя працаўнікі Падляшскага музея, Інстытута археалогіі Лодзінскага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы ды Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Артур Гінтэр з Лодзінскага універсітэта расказаў прысутным пра вынікі раскопак г.зв. вялікай камяніцы, бо менавіта тут засяродзілася двухгадовая праца археолагаў. Гэтая камяніца была пабудавана верагодна ў канцы XVI ст. Быў гэта першы мураваны такога тыпу аб'ект на Падляшшы! Раней тут будаваліся толькі драўляныя двары, а дубнянскі двор быў ластаўкай новай моды, новага стылю, які за рэнесансам завітаў з Італіі і на Падляшша. Вялікая камяніца была пабудавана на плане прамавугольніка размерам 24 на 14 метраў. Таўшчыня апорных сцен даходзіла да амаль паўтара метра. На вуглах збудавання былі праўдападобна абарончыя вежы. Камяніца мела тры паверхі, спалучаныя м.інш. спіральнымі ўсходкамі; да ўсяго гэтага быў яшчэ падвал. Збудаванне паўстала на аснове аднаго унітарнага праекта; у час будовы не ўносіліся ніякія архітэктурныя змены. У вестыбюлі падлога была цагляная, у іншых памяшканнях — з дошак. На першым паверсе была сталовая зала, на другім — „жаночая" і танцавальная, а на трэцім, падстрэшку па-сутнасці — гардэроб.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Новы маршалак Падляшскага ваяводства Дарыюш Пянткоўскі (трэці справа) з'яўляецца гісторыкам па адукацыі

Апрача вялікай камяніцы дваравы комплекс у Дубне ахопліваў таксама і іншыя збудаванні, м.інш. сонечны гадзіннік, свіран, кузня, лазня, стайня, псярня, вазоўня, бровар і... турма! Як бачна, быў у Дубне вялікі грамадскі цэнтр з установамі, якіх няма нават у цяперашніх гарадах, нават найбліжэйшых павятовых; ваяводаў род, мабыць, хацеў мець пад рукой усё тое, што і ў ваяводскім цэнтры.

Іван Сапега — уладальнік Дубна ў 1512-17 гадах

Частка падвалаў была завалена друзам. І менавіта ў друзе захавалася крыху рэштак рухомага інвентара. Бо калі б не такая „звалка", дык тыя ўсе прадметы расцягнула б навакольнае насельніцтва. І той збіты друз, дзе было шмат камянёў перамешаных з глінай, было асабліва цяжка раскопваць. Рыдлёўкі для гэтай працы аказаліся непрыгоднымі, трэба было шукаць кірак. А дзе цяпер, у эпоху экскаватараў і іншых землярыйных машын, знайсці такія простыя прылады? Падалася спадарыня Карвоўска ў Бельск, аб'ездзіла ўсе жалезныя крамы... У адной з іх прадавец задзіваваўся:

— Ад васьмі гадоў ніхто пра кіркі і не пытаў. А тут адразу трэба дзесяць! І то каму — бабе!

Запытаў я Наталлю Пачобут з Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея пра ўдзел беларускага боку ў дубнянскім мерапрыемстве. Гэты ўдзел, які адбываецца ў рамках еўрасаюзнай міжрэгіянальнай праграмы, вельмі істотны, бо ў Гродне знаходзіцца большасць патрэбных архіўных дакументаў. Да таго ж супрацоўніцтва з беластоцкімі ўстановамі падымае ранг гродзенцаў у беларускім маштабе. Калі нядаўна ў Гродне ладзілася выстаўка нашага супольнага гродзенска-беластоцкага археалагічнага здабытку, Мінск, які ў той час паказваў стараскандынаўскую спадчыну ў Беларусі, прызнаўся гродзенцам:

— Вы нас абскакалі...

Даследаванне колішняга Дубна набрала разгону і археолагі спадзяюцца больш дэталёва раскрыць яго гісторыю, гісторыю нашага Падляшша. І такі шанс, здаецца, таксама раскрываецца. Новы маршалак Падляшскага ваяводства з'яўляецца і гісторыкам па адукацыі, і ўраджэнцам не надта далёкага ад Дубна Сельца...

Варта дадаць, што сёлета Падляшскі музей у Беластоку выпусціў кнігу на тэму двара Сапегаў у Дубне, якая ўсебакова падводзіць вынікі ранейшых яго даследаванняў.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Замуж за мяжу ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Што б хто не казаў пра ровень развіцця той ці іншай дзяржавы, але адным з найбольш аб'ектыўных паказчыкаў з'яўляецца колькасць людзей, якія імкнуцца эміграваць з канкрэтнай краіны. У гэтым сэнсе беларускі сацыяльны рай, пра які так шмат гаворыцца ў афіцыйнай прапагандзе, пры бліжэйшым разглядзе аказваецца нічым іншым як мыльнай бурбалкай. Найбольш прыкра, што Беларусь пакідаюць маладыя адукаваныя людзі...

Культура ў Мельніку ☞ 4

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Размова з дырэктарам Гміннага асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі ў Мельніку Віктарам ДАЦЭВІЧАМ.

— Якія мерапрыемствы праводзіць Ваш асяродак у гадавым маштабе?

— Сёлета 6 мая мы ладзілі І фестываль мельніцкага каравая. Гэты наш традыцыйны выраб хочам зарэгістраваць у Еўрасаюзе як рэгіянальную марку і да гэтай мэты было прымеркавана мерапрыемства...

Пушчанскія пенсіянеры ☞ 5

Віктар БУРА

Ужо 10 гадоў Раённаму аддзелу Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы старшынюе Мікалай Чыквін. Члены гэтай арганізацыі высока цэняць ягоную ініцыятыўнасць, дзякуючы якой знаходзіць ён выхад са складаных сітуацый. Старшыня Мікалай Чыквін лічыць, што чалавеку нельга жыць без надзеі, што трэба яму імкнуцца ў лепшы бок, намагацца змяніць жыццё на лепшае...

Сем год ГУЛагу ☞ 9

Ніна БРУЧКО

Добрым і вясёлым чалавекам быў наш дзядзька, толькі яго лёс быў вельмі суровы: сем гадоў прасядзеў ён у ГУЛагу за нішто. Праўда, суддзя (без суда) сказаў: трэба было ў лес ісці, не падчыняцца немцам!

— Вось я табе, Ніна, раскажу, як гэта было, — падхапіла Надзя. — Паехала я аднойчы ў Гродна, цэлы тыдзень жыла ў дзядзькі...

ФОНД „ЦАРКОЎНАЯ МУЗЫКА" Ў ГАЙНАЎЦЫ Ў СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З БЕЛАВЕЖСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПАРКАМ

запрашаюць на

II Белавежскія сустрэчы з арыяй – „У свеце оперы і аперэты".

Выканаўцы: салісты з Польшчы і Беларусі ды Гродзенскі камерны аркестр „Гродзенская капэла".

23.06.2007 г., гадз. 20⁰⁰

– Дзядзінец Прыродна-ляснога музея ў Белавежы.

9 770546 196000

Замуж за мяжу

Што б хто не казаў пра ровень развіцця той ці іншай дзяржавы, але адным з найбольш аб'ектыўных паказчыкаў з'яўляецца колькасць людзей, якія імкнуцца эміграваць з канкрэтнай краіны. У гэтым сэнсе беларускі сацыяльны рай, пра які так шмат гаворыцца ў афіцыйнай прапагандзе, пры бліжэйшым разглядзе аказваецца нічым іншым як мыльнай бурбалкай. Найбольш прыкра, што Беларусь пакідаюць маладыя адукаваныя людзі. Як дасло́ўна казаў некалі адзін мой былы універсітэцкі выкладчык, „вось так і выплываюць мазгі", прытым мужчыны выязджаюць пераважна на працу, а жанчыны найперш імкнуцца знайсці, як кажуць, „удалую партыю".

За савецкім часам замежнікі былі даступныя толькі пэўнай катэгорыі дзяўчат, якія абралі месцам сваёй працы гатэлі-„інтурысты". Памятаеце радкі класічнага айчыннага хіта: „Ёй падабаюцца іншаземцы, яна ўсім целам змагаецца за мір". Рэдкім з іх удавалася заваяваць руку і сэрца закардоннага бізнесоўца ці якога-небудзь дыпламата ніжэйшага рангу. Зараз карціна прынцыпова іншая. Іншаземны „прынц на белым кані" стаў не завоблачнай марай, а явай. Пасля таго, як адкрыліся межы, а таксама сталі развівацца інтэрнэт-знаёмствы, працэс пайшоў неверагоднымі тэмпамі, прычым ён набірае ходу і далей. Паводле афіцыйнай статыстыкі цяпер ажно кожная трэцяя мінчанка выходзіць замуж за замежніка. За 2006 год за мяжу на сталае жыхарства выехала шэсць тысяч беларускіх кабет, лішне казаць, што пераважна гэта маладыя жанчыны і дзяўчаты.

Тэндэнцыя ўзаемнага памкнення з абодвух бакоў тлумачыцца проста. Для замежніка-халасцяка, і тым больш для разведзенага, беларуска ці ўкраінка — гэта патэнцыйна добрая жонка — у сярэднім дбайная гаспадыня, якая хоча нарадзіць прынамсі адно дзіця. Дадайце сюды прыродную прыгажосць нашых дзяўчат (хто сумняваецца, наведайце Мінск, Гродна ці Брэст, найлепш цяперашняй летняй парою, і пашпацыруйце па вуліцах!). Зразумела, што на фоне эмансіпаваных і, здаецца, безнадзейна сапсаваных цывілізацыяй еўрапеек нашы прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва значна выйграюць у вачах рознага роду месье, гераў і сіньёраў.

Зразумець нашых дзяўчат яшчэ прасцей, асабліва правінцыялак, што мараць пра вялікі мегаполіс і срэбны мэрседэс. Куды ім падзецца бедным у сваім Дзятлаве ці Вялікай Бераставіцы (а ёсць жа яшчэ Малая Бераставіца!)? Працы няма аніякай, нават танна аплачваемай, хлопцы ўсе спіліся ўшчэнт — хоць ты ваўчыцай вый у такой сітуацыі. На шыі бацькоў сядзець да трыццаці ці трыццаці пяці год не хочацца, аграгарадкі з хатамі а-ля сабачыя буды таксама не прываблiваюць. Вось і фланіруюць „пералётныя птушкі" па першым выкліку за мяжу. Хто фіктыўны шлюб бярэ, хто сапраўдны — абы зачапіцца, абы застацца, абы пакінуць назаўсёды „сацыяльны рай". Некаторыя пры гэтым, ашуканыя цынічнымі пасярэднікамі, трапляюць у сексуальнае рабства, выбрацца з якога ой як не проста. Іншыя сапраўды знаходзяць сямейнае шчасце, нараджаюць здаровых дзяцей.

Ну а беларуская дзяржава надалей „клапоціцца" пра здароўе нацыі. Прыкладам, у Гродне каля цэнтральнага радзільнага дома высеклі ўсе прысады, якія засланялі будынак ад дарогі. Мала таго, што побач з ім стаіць тэлевізійная вышка, якая дае шкоднае выпраменьванне. Цяпер пад адчыненымі вокнамі раддома, дзе зазвычай стаялі шчаслівыя айцы сямейства, шчыруюць экскаватары і грэйдэры, падымаючы клубы і воблакі пылу. А неўзабаве на месцы былога саду пройдзе аўтадарога — парадзіхі і немаўляты будуць змушаны глытаць бензінава-саляркавы дым. З аднаго боку дзяржава зараз істотна павысіла выплаты за нараджэнне дзяцей (цяпер гэта сума складае 924 тысячы рублёў, што ў эквіваленце складае 430 долараў), з іншага — адабрала ільготы на атрыманне да двух гадоў задарма дзіцячага харчавання і лекаў. Да таго ж беларускія грошы імкліва з'ядае інфляцыя. Вось і выходзіць тое на тое.

Рыба шукае дзе глыбей, а жанчына дзе лягчэй. Краіна Беларусь, жыватворчыя сілы якой спаралізаваныя дэструктыўнасцю адных мужчын і інфантыльнасцю іншых, будзе і надалей губляць сваё генетычнае багацце.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Супраць забыцця

Хто ж з нас не адчувае патрэбы, каб спыніцца пасля доўгага бегу, прысесці на камені, што ляжыць на ростанях, паглыбіцца ў сябе, спрабаваць даць ацэнку, паддаць пад рэфлексію тое, што з намі адбываецца тут і цяпер, заглянуць у прорву глыбі космасу. Ёсць гэта таксама патрэба вылучыцца з грамады, з кампанейскай групы; са структур ад нас шырэйшых, якія ўсё ж нас неяк абмяжоўваюць. Гэта з'яўляецца патрэбай быту — пабыць сабе ў самоце.

Мабыць, гэта важнае сёння, калі мы спрабуем даць ацэнку, ахапіць тую магутную плынь, якая страсянула падмуркамі дзяржаў і народаў, а якую называем рухам глабалізацыі, што, паводле яе прыхільнікаў, мае палягаць на свабодным пераплыве людзей, тавараў, капіталу ці з'яў культуры.

Томас Фрыдман у кнізе „Плоскі свет" стараецца спрыяльна апісаць, ахапіць у сінтэзе тое, што адбываецца на нашых вачах, працягваецца, ператвараецца. Застаецца прытым быць аптымістам, паколькі з'явы, што складваюцца на глабалізацыю, нясуць, на яго думку, рост свабоды, дабра і шчасця ў несустраканым у гісторыі маштабе. Пазіцыя Фрыдмана характэрная для тых, хто бачыць наш свет як цуд натуры, як найвялікшую красу і дабро стварэння, варты адно захаплення. Гэтая пазіцыя тыповая таксама для кола іудзейска-хрысціянскай цывілізацыі, паколькі прынцыпам хрысціяніна з'яўляецца пачаць свой шлях жыцця ад адабрэння быту.

Жывуць, аднак, сярод нас такія, хто бачыць наш свет як ачаг няшчасця і зла, гульбішча сіл цемры, дэманічных і пагрозлівых. Гэтае бачанне, вось, цікава таксама для фанатычных фракцый ісламістаў на палітычнай правіцы. Антыглабалісты бачаць нашу гісторыю, асабліва падзеі ў нашай старой Еўропе, як працяг пакут, зняволення і ўціску, варварскіх войнаў і генацыду. Глабалізацыя паводле іх гэта нішто іншае як экспансія нечалавечнага капіталізму і амерыканізму.

Антыглабалізм ідзе поруч з тэндэнцыямі контркультуры, значыць, адмаўлення, зганьбавання афіцыйнай культуры, на якую складваюцца творы літаратуры і мастацтва ўспрыманыя як скарбы, як класічныя, непахісныя каштоўнасці, як асвенчаная традыцыя („культура гэта крыніца пакут" — вясціў жа ж псіхааналітык Зігмунд Фрэйд). Культываванне мастацтва мае быць лёгкай гульнёю, выпендрошам, правакатарскай выскачкай згодна перакананню, што кожны можа быць мастаком, што кожны, нават выпадковы твор мае такую ж каштоўнасць, а хутчэй недахоп каштоўнасцей. Бо чым жа з'яўляецца праўда, калі не ілюзіяй.

Бунтарства, прага рэвалюцыйнай адмены тыповая для маладзёжнай нецярплівасці, хоць і так бывае, што недаспелыя таксама і старэчы, як тыя героі камедыі Славаміра Мрожка „Танга", што навыперадкі выдумляюць рэвалюцыйнае. Перакананасць рэвалюцыянераў, што магчыма заснаваць каралеўства свабоды і шчасця адразу, шляхам хуткіх, гвалтоўных дзеянняў, а адзінай перашкодай з'яўляюцца атрады агідных ворагаў, іншаверцаў ці паганых буржуяў ды эксплуататараў. Гэта ўява свету з выразна чорна-белай структурай; тут хачу дадаць, што гэта міфічная ўява, значыць, неабавязкова сапраўдная, таму што пазарацыянальная; гэта ўява маніхейская ці заратустрыйская. Свет успрымаецца ў бінарны спосаб, якому характэрны выразныя рысы, межы, антыноміі, такія як свой — чужы, добры — благі, перад — зад і г.д., тыповы для данавуковага, архаічнага мышлення, паколькі мабыць увесь час ён у пераплывах, у мігатлівасці, у нявострых пераходах з аднаго стану ў другі. Міфічная свядомасць, схаваная за ілюзорна рацыянальным доказам, характарызуе, а чаму ж бы і не, шматлікія групы інтэлігентаў, што ганарацца сваёй адукаванасцю і вывучанымі ведамі. Групавыя рэфлексіі нечужыя элітам, у якіх непахісныя погляды на жыццё, на свет.

(працяг на 11 стар.)

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Небяспечная ізаляцыя

Я ўважліва назіраў за дыскусіяй вакол г.зв. сістэмы „квадратнага кораня", значыць, спосабу пералічвання галасоў у Еўрасаюзе, а затым таксама ў справе новага тэксту, які мае замяніць адкінуты канстытуцыйны трактат ЕС. Асабліва шэраг заўваг прыйшло мне ў галаву ў час і пасля візіту ў Польшчу прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі. Як інфармавала штодзённа „Le Figaro", падаўся ён у трэці за сваё прэзідэнцтва візіт якраз у Польшчу, „каб выбіць уступкі, якія ўрэшце дазволілі б Еўрасаюзу выйсці з тупіка". Тут аднак адзін з найбольшых і найбольш уплывовых французскіх дзённікаў адзначае, што размовы з прэм'ерам і прэзідэнтам Качынскімі ў гэтым плане былі вельмі цяжкімі, паколькі „культура кампрамісу не была ніколі моцным бокам братоў Качынскіх". Журналіст папракнуў сёння кіруючых у Варшаве прэзідэнта і прэм'ера ў еўраскепсісе і глыбокай прасуверэннасці. Гэта якраз м.інш. падстава клопатаў з тою кампрамісна-сцю. Не толькі „Le Figaro", але таксама і польскія назіральнікі міжнароднага палітычнага жыцця прыкмецілі, што прапанова, якая абмяжоўвае „сілу паражэння" (прымяненне сістэмы „квадратнага кораня") найбольшых па ліку жыхароў, абшары і гаспадарчым патэнцыяле еўрапейскіх краін вынікае з-за боязі Польшчы галоўным чынам перад Нямеччынай. „Le Figaro" пайшоў нават на асцвярджэнне, што „Нямеччыну Качынскі ўспрымае як драпежніка. Недаверлівасць паглыбляе яшчэ справа нямецка-расійскага газаправода". Ідучы за гэтай думкай, на фоне апасак польскіх прэм'ера і прэзідэнта ў справе пералічвання галасоў і новага канстытуцыйнага трактата, бачацца добрыя адносіны паміж двума „адвечнымі ворагамі" Польшчы: Нямеччынай і Расіяй, хоць гэтая апошняя не з'яўляецца членам ЕС з 27 дзяржаў, ды яе ўплывы хоць бы на замежную палітыку Нямеччыны бываюць сур'ёзнымі. Калі тады прыняць за сур'ёзны тэзіс аб апасках перад Нямеччынай, трэба было б дайсці да высновы, што з польскага пункту гледжання візіт прэзідэнта Сарказі меў сярод сваіх мэт паўплываць на памякчэнне пазіцыі ў справе „квадратнага кораня" не толькі самой Францыі, але і Нямеччыны, асабліва таму, што адносіны паміж гэтымі краінамі прынамсі ад часу канцлера Хельмута Коля амаль ідэальныя і, што важнейшае, абапіраюцца на прынцыпах узаемнай лаяльнасці і салідарнасці. Тут, аднак, няма як не пагадзіцца з былым шэфам польскага МЗС (пачатак уладарання братоў Качынскіх), паслом у Парыжы і Маскве Стэфанам Мэллерам, які пры нагодзе візіту Нікаля Сарказі заявіў:

— ЕС вырас таксама ў маральным сэнсе з Нямеччыны і Францыі. Нямеччыны і Францыі не ўдасца перасварыць, парушыць фундаменты, на якіх абапіраецца іх замежная палітыка.

Варта прыгадаць тое, аб чым успомніў таксама Стэфан Мэллер, што ў перагаворах на тэму пералічвання галасоў польская дыпламатыя здаецца забываць аб Веймарскім трохкутніку (Нямеччына — Францыя — Польшча), які мог бы быць знакамітай арэнай для вырашання ўсялякіх канфліктных агульнаеўрасаюзных пытанняў. У рамках Трохкутніка гэта якраз Францыя магла б быць негацыятарам паміж шостай па велічыні ў ЕС Польшчай і Нямеччынай. Цяперака можа нам здавацца, што Варшава хоча ў нешта гульнуць з Парыжам за спіною Берліна.

Я згодны са Стэфанам Мэллерам, што незалежна ад стылю (урадамагальнага, ультыматыўнага?), у якім у апошні час працягваецца дыскусія, сама ідэя прымянення сістэмы „квадратнага кораня" пры пералічванні галасоў турбуе еўрасаюзныя галовы:

— У гэтым і ёсць сэнс ЕС. Засеяныя ідэі не заўжды адразу мусяць пусціць парасткі.

Думаю так сабе, што трэба было б у рамках гэтай дыскусіі памятаць таксама аб тым, аб чым неаднойчы ўспамінаў у Польшчы Нікаля Сарказі:

— Польшчы неабходна ўцякаць ад ізаляцыі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Дзесяцігоддзе беларускага школьніцтва ў Беластоку

Многая лета дырэктару ПШ н-р 4 Збігневу Клімовічу

Першыя словы якія прыходзяць на думку — мова тут пра святкаванне дзесяцігоддзя беларускага школьніцтва ў Беластоку (12-15.06) — гэта размах. Настаўніцу Аліну Ваўранюк, старшыню аб'яднання АБ-БА Барбару Пякарскую, дырэктара ПШ н-р 4 Збігнева Клімовіча віншавалі прадстаўнікі цэнтральных і ваяводскіх улад, прэзідэнт БНР і амерыканская дыяспара. Рада горада Беластока назначыла Аліне Ваўранюк узнагароду ў катэгорыі анімацыі культуры сярод настаўнікаў. А банкет, які падрыхтавалі бацькі і на які запрасілі ўсіх гасцей, мог спаборнічаць з конкурсам на найлепшы рэгіянальны прадукт.

Самым урачыстым момантам святкавання лічу малебен у Свята-Юр'еўскай царкве, што ў квартале Новае места. Багаслужбу на беларускай мове адслужыў а. Рыгор Місіюк. На непаўторнасць хвіліны паўплывала не адно культурная, прыгожая беларушчына і кранальная пропаведзь айца Рыгора ды беларускі хор. Не менш важным паказаўся грамадскі аспект багаслужбы. Малітва ў грамадзе, якую любіш і паважаеш, напаўняе адчуваннем еднасці і супольнасці. Беларусы рэдка зазнаюць такіх момантаў. Калі глянуць з перспектывы гадоў на феномен беларускага школьніцтва ў Беластоку (усё пачалося з прадшколля, якое існуе ўжо 12 гадоў), то найперш спрацаваў людска-этычны бок справы, сяброўскія і сямейныя сувязі, наладжаныя ў гады дзейнасці ў БАС.

— Я магу сказаць адно, — адзначыла Валянціна Швед, найстарэйшая маці (за што атрымала спецыяльныя віншаванні), — мы з Віктарам Шведам удзячны лёсу, што наша дачка нарадзілася якраз у той час, калі басаўцы арганізавалі школу. Цяжка сказаць ці без урокаў беларускай мовы і „Н.Р.М." мы змаглі б прышчапіць дачцэ беларускасць.

— Беларуская мова не мае сёння практычнага значэння, — кажа Юрый Каліна, які займаўся арганізацыяй урокаў на кожным этапе, ад прадшколля па ліцэй, і які найбольш цэніць нармальнасць у сям'і. — Для мяне самае важнае тое, што ў сям'і можам размаўляць па-беларуску.

* * *

— Пачаткі былі складаныя. Бацькі хваляваліся, што між дзяцьмі могуць успыхаць канфлікты на нацыянальнай глебе, — успамінае дырэктар ПШ н-р 4 Збігнеў Клімовіч. — Практыка паказала іншае. Дзеці ўвогуле не бяруць пад увагу такой магчымасці. Калі і ёсць непаладкі — дык яны з-за іх асабістых спраў. Між дзяцьмі проста такія праблемы не існуюць. Нацыянальныя канфлікты прыдумваюць дарослыя!

Збігнеў Клімовіч адзначае, што апрача беларусаў у школе вучацца ромы і чачэнцы. Прысутнасць меншасцей толькі ўзбагачае школу. Гэта жывы ўрок талерантнасці. Іншая справа, што многія поспехі беларускіх навучэнцаў будуюць прэстыж школы. Вельмі высокая ацэнка накіраваная ў бок бацькоў — людзей, з якімі проста можна заваёўваць самыя высокія поспехі. А настаўніца — Аліна Ваўранюк гэта прыклад таму, што прафесія настаўніка — гэта прызванне!

Тамара Бялькевіч, настаўніца беларускай мовы ў Гарадку, феномен Беластока бачыць у падтрымцы і ангажаванасці бацькоў.

— Немагчыма гэтага параўнаць, — кажа з нейкім болем, — настаўнік у глыбінцы змагаецца ў самоце. Дапамога бацькоў — гэта скарб і аснова!

У старшыні аб'яднання АБ-БА, доктар Барбары Пякарскай, здаровы падыход да навучання і ўсяго працэсу. Ангажаванасць усёй сваёй сям'і тлумачыць заўсёды простымі словамі:

— Усё, што робім, робім для сваіх дзяцей. Іншая справа, што ў працэс развіцця беларускага школьніцтва заангажаваліся ўжо дзесяткі сем'яў. Усе па меры магчымасці аказваюць дапамогу і падтрымку. Плён, які выспеў на працягу гадоў, можна было паглядзець у час мастацкіх тэатральна-музычных прэзентацый, фотавыставак і хронік, дзе важную частку складаюць ніўскія публікацыі.

А пра поспех дзесяці гадоў сведчыць таксама лік навучэнцаў. Ад верасня беларускую мову ў Беластоку будзе вывучаць 159 вучняў.

Тэкст і фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Віцэ-прэзідэнт Беластока Аляксандр Сасна віншуе Барбару Пякарскую

Маладыя акцёры ўмела прадавалі сваё

Зал быў перапоўнены гледачамі

Віктар ШВЕД

Наша дзесяцігоддзе

Свята ў беларускім асяроддзі,
Наша радасць хай плыве далёка!
Адзначаем мы дзесяцігоддзе
Навучання роднай мовы ў Беластоку.

Пачалося, як вядома, ад прадшколля,
Тут сышліся роднай мовы карыфеі.
Мова пашыраецца з іх волі
У пачатковай, у гімназіі, ліцэі.

АБ-БА тут як правадыр знайшлася,
Бацькоў нашых дзетак аб'яднанне,
На чале з ахвярнай надта Басяй,
Ёй якраз вялікае прызнанне!

Неацэннае значэнне педагогаў,
Дзесяць гераічных год Аліны!
Ім падзякі нашай вельмі многа,
Хай далей выконваюць павіннасць.

І таму мы можам ганарыцца,
У юбілей наш дзесяцігадовы,
Што ў малое айчыны сталіцы
Беларускай вучымся мы мовы.

Беласток, 15 чэрвеня 2007 г.

Пераможцы алімпіяды гасцявалі ў БДУ

Пераможцы 13-й алімпіяды па беларускай мове, якая штогод праходзіць у Польшчы, з 13 па 16 чэрвеня былі гасцямі Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску.

14 чэрвеня сустрэліся яны з рэктарам БДУ прафесарам Васілём Стражавым. Акрамя таго, юнакі і дзяўчаты наведалі філалагічны факультэт і музеі Белдзяржуніверсітэта. Для іх былі арганізаваны таксама экскурсіі па Мінску. Юныя знатакі беларускай мовы пабывалі і на спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Арганізатарамі візіту выступілі пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы, кафедра беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта і таварыства дружбы „Беларусь — Польшча".

Дарэчы, такі падарунак — наведванне Беларусі — пераможцы гэтай алімпіяды атрымалі другі раз.

Паводле матэрыялаў БЕЛТА

Весткі з Бельска

Завяршыўся капітальны рамонт моста па вуліцы Баторыя ў Бельску-Падляшскім. Выконваў яго „БУДРЭХ-КОБІ", суполка з Беластока. Інвестарам была Управа горада Бельска-Падляшскага. Жыхарам горада крыху нявыгадна было аб'язджаць па другіх вуліцах, але варта было. Мост цяпер прыгожы ды бяспечны.

* * *

3 чэрвеня г.г. у Варшаве на пляцы пры Вялікім тэатры адбылася забаўляльна-кірмашовая імпрэза п.з. „Падляшскія сялянскія гміны". Арганізатарам яе быў Саюз сялянскіх гмін Падляшскага ваяводства. У імпрэзе прыняла ўдзел таксама Бельская гміна, а ўдзельнічала пад 90 яе жыхароў. У час імпрэзы прамавалася прыгажосць гміны — буклеты, паштоўкі, дапаможнікі, турыстычныя месцы гміны, напрыклад, „Птушыная асада" ў Плёсках, гарадзішча ў Гацьках. Паказаны былі рэгіянальныя стравы Бельскай гміны — хлеб, шмалец, піражкі, малосольныя агуркі, капыткі, мёд, марынаваныя грыбкі. Усе нашы стравы карысталіся вялікім зацікаўленнем. У гэтай імпрэзе Бельская гміна ўдзельнічала ўжо чацвёрты раз, як адзіная з цэлага Бельскага павета. Былі таксама артыстычныя выступленні калектываў.

Вялікая падзяка належыцца арганізатарам гэтай паездкі, дзякуючы якой можна было шырэй запрэзентаваць Бельскую гміну сярод іншых. Ды і ўражанні застануцца ў памяці назаўсёды, асабліва сялянам, якія самі не мелі б магчымасці на такую паездку ў сталіцу.

Жэня МАРТЫНЮК

Культура ў Мельніку


Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Размова з дырэктарам Гміннага асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі ў Мельніку Віктарам ДАЦЭВІЧАМ.

— ***Якія мерапрыемствы праводзіць Ваш асяродак у гадавым маштабе?***

— Сёлета 6 мая мы ладзілі I фестываль мельніцкага каравая. Гэты наш традыцыйны выраб хочам зарэгістраваць у Еўрасаюзе як рэгіянальную марку і да гэтай мэты было прымеркавана мерапрыемства. Па сутнасці было гэта спаборніцтва вытворцаў гэтага прадукта ў дзвюх катэгорыях: прафесіяналаў (кандытарскія прадпрыемствы) і аматараў. Вырабы ацэньвала адмысловая камісія з культуразнаўцаў, мастакоў, фатографаў; м.інш. запрасілі мы ў яе склад Сцяпана Копу, які, аднак, па невядомых нам прычынах не прыехаў. На мерапрыемстве прысутнічала каля чатырохсот асоб. Мастацкае афармленне фестывалю стварылі самадзейныя калектывы з Дашоў і Дабрывады, якія паказалі каравайныя абрады. Мерапрыемства адбылося ў дзень св. Юрыя, калі традыцыйна, апрача вяселляў, выпякалі ў нас каравай.

30 чэрвеня і 1 ліпеня ладзім чарговыя Дні Мельніка. Сёлета іх пуцяводнымі будуць два матывы. Першы — „Czy nas jeszcze pamiętasz" — асветляць вядомыя зоркі польскай эстрады, м.інш. Ірэна Яроцка, Галіна Куніцка, Пётр Шчэпанік і Януш Ляскоўскі; гэтыя вакалісты выступалі ў мінулым у Мельніку і іх выступы будуць менавіта ўспамінам. Другі матыў — „Dla każdego coś dobrego" — прадвяшчае забаву ў суправаджэнні разнароднай музыкі; тут прадбачваем калектыў „PIMA", лацінаамерыканскую музыку, балады Акуджавы і Брэхта, шанты, бітавы ансамбль „The Postman", дыскаполавы „Preludium", кабарэ „Widelec". Мерапрыемства аздобіць паказ феерверкаў і танцавальная музыка.

У палове ліпеня плануем фестываль танцавальнай музыкі, а ў жніўні — канцэрт праваслаўнага вайсковага хору з Вроцлава. 10-14 ліпеня ў Мельніку і Сямятычах пройдзе розыгрыш юніёрскага чэмпіянату Польшчы па футболе.

11-12 жніўня ладзім 17-я Музычныя дыялогі над Бугам. У час гэтага мерапрыемства хочам паказаць мазаіку ўсіх нацыянальных меншасцей не адно з Беласточчыны. Запрашаем беларусаў, украінцаў, ромаў, грэкаў, армян, татараў, кашубаў, курпяў, горцаў, немцаў, славакаў, літоўцаў; прыедуць таксама калектывы з Чэхіі і Калінінграда.

У палове верасня ладзім „Развітанне з летам", шантавае мерапрыемства, мэтай якога з'яўляецца папулярызацыя спартыўна-турыстычных козыраў нашага Пабужжа.

— ***Усе гэтыя мерапрыемствы ладзіце ва ўрочышчы Тапаліна?***

— Усе пленэрныя ладзім там.

— ***Будынак Вашага Гміннага асяродка культуры, здаецца, даволі новы...***

— Пабудаваны ён у 1980-х гадах.

— ***А што з будынкам кіно? Тратуар перад ім прарастае траўкай...***

— Будынак кіно хочам адаптаваць на рэгіянальны музей, які прэзентаваў бы мясцовае рукадзелле ды карціны мастакоў звязаных з Мельнікам.

— ***Якімі іншымі аб'ектамі распараджаецца Ваш асяродак?***

— Маем стадыён з дзвюма футбольнымі пляцоўкамі: галоўнай з сучаснай трыбунай для гледачоў і трэніровачнай. Хочам пабудаваць два корты і дзве валейбольныя пляцоўкі. Наш спартыўны комплекс хочам вывесці на Буг пляжам. У гэтым могуць нам перашкодзіць эколагі, якія ў пляжы бачаць пагрозу для насякомых. Але мы бачым іншую пагрозу, што нам зарасце Буг. Калісь у Мельніку было чатырыста кароў, якія пасвіліся на прыбужанскіх пашах, а цяпер тых кароў асталося толькі пяць...

Маем таксама адпачынковы цэнтр з шасцю домікамі і крытай павеццю ды з санітарнай базай. Рамантуем матэль для звыш трыццаці асоб.

У Вілінаве працуе Вясковы дом культуры, спорту і рэкрэацыі, які ладзіць Троіцкі фэст ды канцэрты беларускіх і ўкраінскіх калектываў. Пры святліцы ў Машчонай-Каралеўскай працуе вакальны калектыў „Навіна", у якога рэпертуары беларускія, украінскія і польскія песні. Пры мельніцкім асяродку маем калектыў „Мельнічанкі" з шасці асоб.

— ***Чым займаеце дзяцей і старэйшых?***

— Раз у месяц ладзім тэатральныя майстар-класы. Наведвае нас тады Лялечны тэатр з Беластока, які паказвае спектакль і знаёміць з яго выканаўчымі азамі. Працуе ў нас фатаграфічны гурток, які збірае дакументацыю мельніцкіх крыжоў, асабліва найстарэйшых, металічных. Дзейнічае турыстычна-краязнаўчы гурток, які збірае дакументацыю і праводзіць разметку турпраходаў па Лініі Молатава. Марым пра аднаўленне аднаго з бункераў для музейных мэтаў.

Дзецям ладзім Дзень дзіцяці, ёлку, дэкламатарскія і мастацкія конкурсы. У дзіцячым садку памагаем весці тэатр дашкольнікаў, які сёлета ставіць „Снягурачку".

У летні перыяд ладзім два турніры пляжнага валейбола пасярэдзіне Буга! Калі ў рацэ меншае вады, тады з яе выныраe пясчаная выспамель, якой дастаткова для валейбольнай пляцоўкі.

Ладзім міні-марафон, даўжынёю ў 4,5 км, шляхам мельніцкага прарыву Буга. Прапануем турпраходы шляхам цудоўных крыніц Катэрка — гара Правалы — Грабарка і па Лініі Молатава.

Старэйшым мельнічанам прапануем двойчы ў тыдзень аэробіку.

— ***З якімі грамадскімі суб'ектамі ладзіце супрацоўніцтва?***

— Згуртаванню пенсіянераў дапамагаем ладзіць літаратурныя сустрэчы і танцавальныя вечарыны. З Надлясніцтвам Нурэц супольна пракладваем усходкі на гару Правалы, а далей хочам гэтакім чынам пабудаваць назіральную вышку на гары Ушэсце ды пракладку адукацыйнай дарожкі там жа па месцах прарастання стэпавых эндэмікаў.

Некалькі гадоў таму разам з беластоцкім Археалагічным музеем ладзілі мы выставу аб Мельніцкай зямлі, на якой былі паказаны знойдзеныя ў нас памяткі нашай даўніны. У будучым годзе хочам збудаваць макет мельніцкага замка. Вядома, што быў ён з драўніны, ведаем яго каардынаты, адно толькі невядома, чым ён быў накрыты. Таму макет хочам выканаць у зімовым афармленні, з накрытым снегам дахам...

Супрацоўнічаем з Надбужанскім таварыствам прыгожых мастацтваў і з Таварыствам прыяцеляў Мельніцкай зямлі. Раней у рамках Згуртавання пабужных паветаў сумесна з Ласіцамі ладзілі мы байдарачныя паходы па Бугу, а цяпер, вось, паглядаем у бок еўрарэгіёна Белавежская пушча. Маем кантакты з Аддзелам культуразнаўства Універсітэта ў Беластоку ды з Ваяводскім асяродкам анімацыі культуры.

— ***А з Беларускім таварыствам?***

— Сёлета Таварыства не атрымала сродкаў. І нам таксама абрэзалі, ні залатоўкі не дае нам ні Маршалкоўская ўправа, ні Ваяводская. Мерапрыемствы ладзім толькі дзякуючы Гміннай управе і спонсарам.

— ***Багатых спонсараў маеце?***

— Небагатыя яны. Гэта мельніцкія і сямятыцкія фірмы. Напрыклад, сямятыцкі ПКС размяшчае ў сваіх аўтобусах нашы плакаты. А іншыя мясцовыя фірмы ў рамках свайго спонсарства забяспечваюць нашы мерапрыемствы, напрыклад, напоямі ці начлегамі.

— ***Дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Па ініцыятыве Раённага аддзела Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў Гайнаўшчыну нядаўна наведалі пружанскія пенсіянеры. Беларускія госці на працягу двух дзён знаёміліся з Гайнаўшчынай і сталічнай Варшавай...

Пушчанскія пенсіянеры

Ужо 10 гадоў Раённаму аддзелу Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы старшынюе Мікалай Чыквін. Члены гэтай арганізацыі высока цэняць ягоную ініцыятыўнасць, дзякуючы якой знаходзіць ён выхад са складаных сітуацый. Старшыня Мікалай Чыквін лічыць, што чалавеку нельга жыць без надзеі, што трэба яму імкнуцца ў лепшы бок, намагацца змяніць жыццё на лепшае. Пад яго кіраўніцтвам гайнаўскі аддзел пенсіянерскай арганізацыі штогод ладзіць шмат культурных і забаўляльных мерапрыемстваў ды краязнаўчых экскурсій для сваіх членаў.

Старшыня Мікалай Чыквін няраз пабываў з візітам у братняй Беларусі, у выніку чаго наладзілася супрацоўніцтва паміж пенсіянерамі Гайнаўкі і Пружан. З беларускага боку пенсіянерам у абмене выдатна дапамагаюць дырэктар Пружанскага гарадскога дома культуры Васіль Курачынскі і мастацкі кіраўнік народнага хору „Чырвоная гваздзіка" Валянціна Карабко.

Па ініцыятыве Раённага аддзела Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў Гайнаўшчыну нядаўна наведалі пружанскія пенсіянеры. Беларускія госці на працягу двух дзён знаёміліся з Гайнаўшчынай і сталічнай Варшавай.

Раніцай 1 чэрвеня 2007 года стаяла пахмурнае надвор'е. А гадзіне 7.45 пад магазін „Бядронка" ў Гайнаўцы пад'ехаў шыкарны аўтобус. Шафёр Анатоль Раманюк запрашае дэлегацыю гайнаўскіх пенсіянераў усярэдзіну. Аўтобус напраўляецца да пагранперахода ў Белавежы, дзе маем забраць пружанскую дэлегацыю з 30 чалавек. Пагранічнікі спраўна прапусцілі беларускіх гасцей, якіх гайнаўская дэлегацыя на чале са старшынёю Мікалаем Чыквіным прывітала хлебам, соллю і кветкамі.

У Гайнаўцы госці спярша наведалі могілкі савецкіх салдат і партызан. Пружанскія ветэраны вайны і працы ўсклалі кветкі да помніка, запалілі знічы і хвілінай цішыні ўшанавалі памяць загінуўшых салдат. З радасцю і ўсхваляваннем прынялі яны той факт, што гайнавяне дбаюць пра могілкі, на якіх панує чысціня і парадак, што ставяцца да некраполіі як да святога месца.

Пасля старшыня Мікалай Чыквін запрасіў гасцей на снеданне ў Дом міласэрнасці „Самаранін" пры Свята-Троіцкім прыходзе. Затым гасцям была прапанавана паўтарагадзінная прагулка па Гайнаўцы і парку, пасля якой усе паехалі ў Нараўку.

Перад будынкам Гміннай управы ў Нараўцы пружанскіх гасцей прывітаў сакратар гміны Міхал Бароўскі. У канферэнц-зале, за сталамі застаўленымі пячэннем, шакаладнымі цукеркамі і напоямі, дэталёва распавёў ён пра гісторыю і сучаснасць Нараўчанскай гміны. На памяць аб пабыўцы госці атрымалі альбомы „Лідэр польскай экалогіі — вылучэнне 2001 года" і наборы каляровых адкрытак пра гміну. Гаспадары Нараўчанскай гміны паказалі гасцям комплекс мясцовых школ — падставовую імя Аляксандра Валкавыцкага і гімназію імя Тамары Саланевіч.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Белавежа, 1 чэрвеня 2007 г. Кіраўнікоў пружанскай дэлегацыі Валянціну Карабко і Васіля Курачынскага (у цэнтры) хлебам і соллю прывіталі сакратар Раённага аддзела Польскага саюза пенсіянераў і інвалідаў у Гайнаўцы Эдуард Бай (першы злева) і старшыня Мікалай Чыквін (першы справа)

Перад комплексам школ гасцей з Беларусі прывіталі дырэктар гэтай установы Марыя Леўша і настаўніца беларускай мовы Лілія Тарасевіч. Педагогі паказалі пружанскім пенсіянерам сучасны школьны будынак і пазнаёмілі іх з асветнымі пытаннямі на тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Гасцям асабліва спадабалася аснашчэнне кабінета беларускай мовы. У школьнай сталовай госці паабедалі, а на развітанне атрымалі на памятку сшыткі з выявай школьнага будынка. На канец пабыўкі ў школе госці зрабілі памятны здымак перад будынкам — тады якраз на коратка паявілася сонца.

Зноў пачынае імжыць дождж. Аўтобус з пружанскай дэлегацыяй накіроўваецца на Семяноўскае вадасховішча. Там на плаціне гасцей сустракае гаспадар гэтага аб'екта інжынер Лявон Хлябіч. Расказаў ён, што штучны вадаём быў збудаваны ў 1977-1990 гадах. Доўгі ён на 11 км, шырокі ад 0,8 км да 4,5 км, глыбіня яго дасягае ад 2,5 да 9 метраў. З 1996 года працуе тут гідраэлектрастанцыя магутнасцю ў 165 кВт. Лявон Хлябіч адзначыў, што вадаём у зладжаны спосаб упісаўся ў навакольны краявід. Многа тут вадаплаўных птушак, агулам жыве 160 відаў птаства, а вакол вадаёма водзяцца ласі, алені, сарны, дзікі, бабры, норкі, выдры. Летам Семяноўскае вадасховішча наведвае шмат турыстаў і вудзільшчыкаў.

Чарговым этапам паездкі па Нараўчанскай гміне быў Асяродак экалагічнай адукацыі ў Семяноўцы. Там яго загадчыца Эвеліна Клімюк пазнаёміла гасцей з працай асяродка і запрасіла на абед. З-за абмежаванасці часу гасцям не ўдалося пабачыць усяго, што прапанавалі гмінныя ўлады, якім ёсць чым пахваліцца.

Вяртаемся ў Гайнаўку. Тут у Доме культуры ў 18 гадзін пачалася сустрэча пружанскіх і гайнаўскіх пенсіянераў з удзелам мясцовых улад — бурмістра горада Анатоля Ахрыцюка, віцэ-старасты павета Юрыя Сірака і дырэктара ГДК Андрэя Скепкі. У час сустрэчы Мікалай Чыквін і Васіль Курачынскі адзначылі, што такія сустрэчы пашыраюць кола сяброў, дазваляюць наладзіць больш шчыльныя сувязі і культурны абмен паміж пенсіянерскімі арганізацыямі Польшчы і Беларусі. У час гэтай сустрэчы былі застолле, танцы і тосты, а народны хор „Чырвоная гваздзіка" з Пружан выступіў з канцэртам беларускіх, рускіх і ўкраінскіх песень, чым парадаваў сэрцы і душы прысутных.

На другі дзень, 2 чэрвеня, старшыня Мікалай Чыквін для гасцей з Пружан падрыхтаваў экскурсію ў Варшаву. У сталіцы, згодна плану, пабывалі яны толькі чатыры гадзіны. І хаця за так кароткі час пабачыць многа не ўдалося, аднак гасцям наша сталіца вельмі спадабалася.

Шафёр бярэ курс на Гайнаўку. Па дарозе гаспадары запрасілі гасцей падсілкавацца. У час пачастунку паплылі сяброўскія, шчырыя ўспаміны, словы радасці ад пабачанага і перажытага за гэтыя два дні на Гайнаўшчыне.

А вось і пагранпераход. Надыходзіць час развітання. Пацалункам, сардэчным словам падзякі для старшыні Мікалая Чыквіна і яго пенсіянераў не было канца. Была і чарка на пасашок, бо адпусціць без яе гасцей у Пружаны было б не па-славянску.

Карыстаючыся нагодай, што ў кастрычніку народны хор „Чырвоная гваздзіка" адзначаць будзе 25-гадовы юбілей, ад усёй душы жадаю ім ад сябе і ад імя гайнаўскіх пенсіянераў слаўна адсвяткаваць гэтую дату, у самым найлепшым настроі, за багатым сталом, разам з блізкімі ім людзьмі. Няхай вашы мілагучныя песні звіняць і расслаўляюць Беларусь не толькі ў краіне, але і па-за яе межамі. Моцнага здароўя вам, поспехаў ва ўсіх справах, міру і шчасця вашым сем'ям!

Віктар БУРА

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Купала і Колас

Жывуць сёння з намі
Купала і Колас —
Два волаты нашага роднага слова,
Два аднагодкі, два песняры —
Сыны беларускай зямлі.

З крыніц Беларусі,
З народных вытокаў
Чарпалі натхненне Купала і Колас,
Пісалі аб родных палях і дубровах,
Аб цяжкім жыцці, аб нядолі народа.

А ў час змаганняў
Купала і Колас натхнялі народ
Пастаяць за свой гонар,
Змагацца за шчасце, змагацца за долю,
За родныя хаты, за матчыну мову.

Жывуць з намі ў думках
Купала і Колас —
Два волаты беларускага слова.
Як слава народная два песняры —
Сыны беларускай зямлі.

Асталіся ў песнях Купала і Колас.
Нясуць беларусы ў сэрцах іх голас.
Складаюць ім песні ў лугах і дубровах
Магутны Дняпро ды няўрымслівы Нёман.
І шэпча калоссе пад Мінскам у полі:
„Купала і Колас не змеркнуць ніколі".

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Жыві, „Ніва"!

Пасылаю пажаданні
Я тыднёвіку „Ніва",
Каб усе былі здаровы
Ды жылі шчасліва.

І каб у вашых сем'ях
Усе жылі ў багацці —
Таго вам жадае
Ваш сябра-прыяцель.

Каб вы нашу „Ніву"
Шчыра расслаўлялі
Ды наступнае пакаленне
Да працы рыхтавалі!

Каб тыднёвік „Ніва"
Рос як рунь на ніве,
Каб яго ўсе чыталі
Ды былі шчаслівы.

Вось за гэта, знайце,
Трэба нам змагацца,
Тым, што нас не любяць,
Ніяк не паддацца.

Няхай наша „Ніва"
Па свеце гуляе,
Кожны з нас у сэрцы
Хай яе трымае!

Мікалай ПАНФІЛЮК

Прывітанні

Сардэчна ўсіх вітаю
І да дабра заклікаю —
Дарагія суседзі і сябры,
Усе, з кім добра дружыў.

Усіх, каму весткі дастаўляў
Пра наш беластоцкі край.
І вас, дарагія нашы дзеткі —
Наследнікаў нашага свету.

Вы пойдзеце збіраць плён,
І вам ад мяне шчыры паклон,
Жывіце дружна, багата,
Каб рада была ваша хата.

У школе збірайце шасцёркі,
Каб мінаваў вас лёс горкі.
Шануйце добрых людзей,
Каб жыць было весялей.

Паважайце бацькоў сваіх,
Каб здарова і добра жылі.
Не забывайце пра Бога,
Бо з Ім да шчасця дарога.

Мая павага і ўсім гасцям —
Каб добра жылося вам!
Каб радасць, здароўе і шчасце
Заўсёды жылі ў вашай хаце!

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Дзесяцігоддзе беларускага школьніцтва ў Беластоку

„Казка пра надта сумнага асла”

Оля і Наталька — дзяўчаты ціп-топ

Аляксандр — бацька-кароль у пастаноўцы „Усе хлопцы дуронікі”

„Воўк і авечкі”

„Салістка” Ніка

Кветкі настаўніцам Ані Бабік і Аліне Ваўранюк

Фоты Ганны КАНДРАЦЮК

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 35 —

Вы пэўна ўжо забыліся пра класнага жуліка Міколку. Я пра яго даўно не пісала, бо ён, дзякуючы сваёй дзяўчыне, стаў ідэалам. Усе настаўнікі былі захоплены гэтай метамарфозай, але мы, вучні — не! Кожны мой аднакласнік жадаў, каб ён расстаўся з дачкой настаяцеля і зноў стаў Міколкам, як раней...

Учора мы з Ганкай і Касяй пайшлі ў царкву на абедню. Нас вельмі здзівіла, што сярод прыслужнікаў не было нашага сябры. Мо ён пасварыўся з Марысяй?

— А можа яны рассталіся, — падумала ўголас Кася.

— Не думаю, — адазвалася Ганка, — я ўпэўненая, што ён быў у царкве на ютранні...

Ганка аднак памылялася. Мы пасля даведаліся ад Ігара, што Міколка ўсю нядзелю ездзіў з ім на скейце.

— Супер! — выгукнулі мы ў адзін голас. — Міколка зноў будзе Міколкам! Супер! Супер! Супер!

У панядзелак хлапец зусім інакш апрануўся, ён не быў як апошнім часам у белай кашулі і камізэльцы, а толькі ў блузе з капюшонам.

— Міколка мае новую дзяўчыну, — сказаў нам на перапынку Ігар, — і вяртаецца да сваіх прывычак. Учора вечарам ён пабіўся з *дрэсамі* і *скінхедамі*...

— Але ж раней ён сам быў *дрэсам*, — здзівілася я, — няўжо ён памяняў субкультуру.

— Ну так! — усміхнуўся Ігар. — Яго новая дзяўчына ёсць *эмо*. Ды і ён мусіць цяпер быць такім як яна.

— Мусіць??? — спыталі мы хорам... бо адказ Ігара нас захапіў.

— Ну так!

— І цяпер ён ездзіць з табой на скейце? — спытала Ганка.

— Ну так!

— *Востра!*

— Хоць лепш калі Міколка будзе *эмо*, — сказала Кася, — бо як выдатнік ён быў нецікавы...

— А чаму ён расстаўся з Марысяй? — пацікавілася я.

— Гэта яна яго кінула...

— Бедны Мікалай, — сказала я, хоць папраўдзе я не спачувала яму.

Мы пайшлі на ўрок інфарматыкі. Настаўнік на момант пакінуў нас саміх у зале і не выключыў свайго камп'ютэра. Большасці вучням нашага класа пагражае тройка па гэтым прадмеце, таму Міколка дарваўся да камп'ютэра настаўніка, каб памяняць нашы ацэнкі на лепшыя...

— Хутчэй, хутчэй! — паганяў яго Паўл. У яго былі самыя дрэнныя ацэнкі па інфарматыцы. І цяпер ён лічыў, што наш жулік яго выратуе. Аднак Міколка не паспеў...

— А што ты, Коля, тут робіш? — здзівіўся настаўнік, які нечакана вярнуўся ў клас.

— Я таго... — запыкаўся новаспечаны скейт, — я правяраю тэму...

— Добра, — з насмешкай сказаў інфарматык, — тады раскажы, што было на апошнім уроку.

Міколка, як вядома, усю нядзелю правёў на скейце і не быў падрыхтаваны. Ён з ходу атрымаў адзінку. Першую... ад двух месяцаў!

Тэкст: <natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@tlem.pl>

Вершы Віктара Шведа

Калісь і сёння

Настаўнік кажа: — Дзеці,
Чалавек на свеце
Калісь жыў да тых пор,
Пакуль аж не памёр.

А сёння, як вядома,
Жыве ён па-другому,
Трэба аб гэтым ведаць:
Пакуль не пераедуць.

Супрацоўніцтва

— Не магу, мой дружа Лёва,
Стрымаць дадзенага слова.
Не магу я са спакоем
Сёння ў кіно пайсці з табою.

Павінен я, хачу прызнацца,
Дапамагчы бацькам у працы,
Каб вырашыць з перакананнем
Мае ўсе хатнія заданні.

Казка пра цудоўны Луг, прыгожыя Краскі і злога Павука

На шырокім Лузе, што раскінуўся ля правага берага Ракі, жылі прыгожыя Краскі. Яркія, духмяныя. А яшчэ — акуратныя і працавітыя. Зранку прачыналіся з першымі промнямі Сонца, мыліся сцюдзёнай расой, ад чаго яшчэ мілейшымі станавіліся. Кропелькі расы былі ім і заміж люстэрка. Ну як лішні раз не палюбавацца сабой-прыгажуняй?! Прыбраўшыся, усё вакол сябе да ладу даводзілі. Наліваліся духмяным сокам і аддавалі яго працавітым Пчолкам, што цэлым роем з ранку да вечара віліся над цудоўным Лугам.

А гаспадаром тут быў добры і мудры Званочак. Спрадвеку вёў ён рэй на Лузе. Уставаў раненька, яшчэ да ўсходу Сонца. Сам купаўся ў празрыстай расе, а пасля пачынаў голасна звінець-спяваць, будзячы астатніх Красак:

Прачынайцеся, сяброўкі!
Падымайцеся, галоўкі!
Сонейка на небе ўстала,
Нас ласкава прывітала,
Нам паслала дзіва-промні,
Ясны, светлы дзень чароўны!

Вечарам, калі Сонейка сплывала за небакрай, Званочак спяваў сваім стомленым, сонным сяброўкам пяшчотную калыханку:

Мы за Сонейкам услед
Адыходзім на спакой.
Ночка ахіне крылом
Наймілейшы наш Луг-дом.
Спіце, мілыя сяброўкі,
Хай вакол панує сон!

А недалёка ад Лугу, у старым змрочным алешніку, жыў злы Павук. Не такі, як усе Павукі, а чорны, вусаты. Моцна зайздросціў ён таму ладу і парадку, што бачыў на Лузе. А зайздрасць, як вядома, сіла страшная, знішчальная. Вось і надумаў ён загубіць Луг. Ноччу, калі ўсе Краскі салодка спалі, падкраўся Павук да Званочка, аплёў яго цягучай густой павуцінай, моцна сціснуўшы пялёсткі. А бомку-язычок вырваў, са злосцю кінуў на зямлю і растаптаў. Каб і гуку Званочак прамовіць не змог.

Настаў ранак. Сонейка ўзышло. А Луг спіць. Ужо і раса высахла. А Краскі не прачынаюцца. Лье Званочак слёзкі, а заспяваць не можа. Плакаў-плакаў і зусім змарнеў ад гора, сохнуць стаў. Бо вядома ж: хто гаруе, той і марнее.

Урэшце Сонца так моцна прыпякло, што Краскі прачнуліся. Захваляваліся, нічога зразумець не могуць. Дзе Званочак? Так і не знайшлі яго, ссохлага, між густой травы. Хацелі памыцца, прыбрацца, а расы няма. Так і стаялі, не ведаючы, што рабіць. Пчолкі ўгледзелі, што Краскі нямытыя, нясвежыя, непрыбраныя, не захацелі збіраць тут нектар. Сум і гора апанавалі Луг. Краскі пачалі сохнуць і гінуць. А на іх месцы выраслі асот, асака. Цудоўны Луг ператварыўся ў дзікае Балота.

А што Павук? З зайздрасцю паглядае ён на прыгожы Луг каля левага берага ракі...

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ
Гродна

Польска-беларуская крыжаванка № 25



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 21: Лаз, рэха, лава, клінок, бландзін, Інка, тыгр, твар, дыня, кіно, пара. Клірык, лан, ні, лінк, Ян, мандат, воз, вы, ракіта, нырка, ха, царква.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Ася Стоцкая, Рафал Скепка, Магда Куптэль, Караліна Шумарская, Мар'ёля Анішчук, Матэвуш Лапінскі** з Дубін. **Віншуем!**

— Не саромеюся, што з'яўляюся праваслаўным беларусам і гавару з сямейнікамі па-свойму...

ЗБЕРАГЧЫ СПАДЧЫНУ

Турыстаў, якія прыязджаюць на начлег у агратурыстычную кватэру Міхала Фільяновіча ў Скарышэва Нарваўскай гміны, уражвае вялікая колькасць цікавых экспанатаў, размешчаных у двухпавярховым будынку і побач яго. Гаспадар у беластоцкім архіве і з дакументаў у наваколь-ных прыходах сабраў многа інфармацыі наконт гісторыі сваёй вёскі і наваколля, пра якую распавядае турыстам. Спадар Фільяновіч вельмі шырока разбудаваў свае выстаўкі і побач даўніх хатніх прыладаў ці вырабаў з палатна сабраў прылады працы, якімі карысталіся рамеснікі, друкаваныя помнікі мінуўшчыны, старыя манеты, а на асаблівую ўвагу заслугоўвае калекцыя рэлігійных экспанатаў XIX стагоддзя. Скарышэўскія выстаўкі глядзелі таксама турысты з Беласточчыны, а вучням падставовых і гімназічных школ гаспадар ладзіў адкрытыя дні з дадатковымі атракцыёнамі.

Я спатыкаюся з Міхалам Фільяновічам на ягоным вялікім панадворку абсаджаным разнароднымі відамі расліннасці. Многа тут кустоў руты, ад якой выводзіцца назва агратурыстычнай кватэры.

— Мы чырвоную руту знаем толькі з песень, бо наша цвіце жоўтым колерам, — заяўляе спадар Міхал.

На панадворку больш за трыццаць відаў расліннасці. Побач шматлікіх кветак, якімі займаюцца жонка Ганна і дачка Марыя, растуць зялёныя шляхетныя кусты і фруктавыя дрэўцы, за якімі наглядае гаспадар. Выкапаў ён таксама сажалку, у якой водзіцца рыба. Якраз з вудачкай у руках сядзіць каля сажалкі другая дачка Фільяновічаў, якая разам з мужам прыязджае з Беластока сюды на адпачынак.

— Гэты камень вельмі цяжкі і складана было прывезці яго з поля на панадворак. Аднак мяне зацікавіла гэтае паглыбленне на ім, падобнае на адціснутую ступеньку і таму я рашыўся палажыць камень побач хаты, — кажа Міхал Фільяновіч. Звяртае ён таксама ўвагу на гістарычныя весткі пра Скарышэва, змешчаныя па-польску на дошцы побач музейнага будынка, каб маглі пазнаёміцца з імі турысты. Можна тут прачытаць, між іншым, што сяло было заснаванае ў палове XVIII стагоддзя і з'яўлялася прадмесцем горада Нарвы. Мой суразмоўца раздабыў таксама інфармацыю пра сваю сям'ю. Аказваецца, што ягоныя продкі былі на месцы здаўна, а Аляксандр Фільяновіч у канцы XVIII стагоддзя жыў у двары Дарагатынка, распаложаным побач Скарышэва. Над уваходам у асноўную частку музейнага будынка віднее лозунг „Сардэчна вітаем" і далей усе надпісы пры экспанатах змешчаны толькі на беларускай літаратурнай мове. Нават на першай старонцы інфарматара пра агратурыстычную кватэру, які распаўсюджваецца па Польшчы, Міхал Фільяновіч змясціў здымак з кірылічным надпісам. Лічыць ён, што беларуская нацыянальная адметнасць не знеахвоціць польскіх і замежных турыстаў да прыезду ў Скарышэва, а наадварот, можа дадаткова іх прыцягваць.

— Надпісы на беларускай мове выканалі мне ў Галоўным праўленні БГКТ у Беластоку. Яшчэ гайнаўскі натарыус Сцяпан Васілюк купіў мне гіпсавую панэль, якой падбіў я дах на другім паверсе выставачнага будынка і гэта ўся дапамога, якую я атрымаў у час сваёй дзейнасці ў падтрымку нашай культуры. Звяртаўся я за дапамогай у самаўрадавыя і іншыя ўстановы, але не атрымаў яе ніадкуль. Усё выканаў я сваімі рукамі і за свае грошы, — тлумачыць спадар Міхал. — Мяне старыя прылады працы і даўнія вырабы проста цікавяць, а стаў я збіраць іх, каб не прапалі і захаваліся для наступных пакаленняў.

У музейным будынку Міхал Фільяновіч паказвае мне хатнія прылады працы і вырабы, якімі карысталіся вясковыя гаспадыні. Далей стаяць плеценыя з саломы і драўляныя сельскагаспадарчыя прылады. Мой субяседнік паказвае як працуюць жорны, але не затрымліваецца доўга побач вырабаў, якія паўсюдна паказваюцца ў школьных ці гмінных рэгіянальных ізбах. Далей знаходзіцца старая драўляная лодка і прылады працы рыбаловаў. Мой экскурсавод перакананы, што стары ўручную вычасаны човен выкананы быў перад Першай сусветнай вайной, а сеткі зроблены былі ў міжваенны перыяд. Гэтую незвычайную калекцыю папаўняюць чучалы галоў шчупакоў і іншай драпежнай рыбы. Пасля акажацца, што збіраючы „мінуўшчыну" спадар Фільяновіч прыдбаў многа іншых арыгінальных экспанатаў, якіх покі нельга знайсці на выстаўках на Гайнаўшчыне. Маю тут на ўвазе хаця б калекцыю з пабольшанымі адбіткамі пячатак праваслаўных прыходаў з Беласточчыны і нарваўскіх суда, ратушы і думы з XIX стагоддзя. На апошніх зверху віднеецца тур (сімвал Бельскай зямлі), а знізу — лодка са стрэламі, што плыве па рэчцы. Гэтыя сімвалы, паводле спадара Фільяновіча, трапна спасылаюцца на гісторыю калішняга горада Нарвы.

На другім паверсе размешчаны рэлігійныя экспанаты, дзе побач рызаў і плашчаніцы з XIX стагоддзя знаходзяцца старыя крыжы невялікіх памераў, знойдзеныя ў старых цэрквах. Сярод мілітарыяў Міхал Фільяновіч паказвае на кулю з часоў шведскай вайны, знойдзеную каля Кожына. Побач прыладаў, якімі карысталіся пчалаводы, ёсць вулей ад 1927 года. У групе музычных інструментаў знаходзяцца баяны, зробленыя ў 1920 і 1932 гадах. Спадару Міхалу ўдалося сабраць даўнія грошы, сярод якіх ёсць невялікая калекцыя металічных манет (найстарэйшыя з XVII стагоддзя).

— Капаючы фундаменты пад дом я знайшоў некалькі польскіх старых манет з XVIII стагоддзя і ад гэтага часу пачаў я збіраць старыя грошы. Манеты, якія мне перадалі людзі, знойдзены былі на палях і панадворках, — расказвае мой суразмоўца. Апрача свецкіх кніжак з XVIII і пачатку XIX стагоддзяў знаходзяцца ў спадара Фільяновіча экземпляры рэлігійных выданняў. Мяне зацікавіў царкоўны народны двухтыднёвік „Праваслаўны беларус" з 1925 года з паметкай першага года выдавання. На канец экскурсіі па музейных памяшканнях спадар Міхал паказвае старую вопратку з тэрыторыі Беласточчыны. Ёсць тут многа вырабаў з палатна, якія раздабыла Вольга Скепка з Беластока, якой сям'я выводзіцца з Заблоччыны. Побач саяна, вышываных кашуль і іншых даўніх убораў знаходзіцца стылізаваная на даўні лад вопратка, якую мой суразмоўца атрымаў з Рэспублікі Беларусь.

— Гэты касцюм атрымаў я ва ўзнагароду за захоўванне беларускай культуры, — кажа Міхал Фільяновіч і дадае, што ягоныя калекцыі аглядалі беларускія дыпламаты.

На музейным будынку вісіць многа кавальскіх вырабаў, якія мой суразмоўца будзе яшчэ чысціць з іржы і кансерваваць. Звяртае ён увагу на старэйшыя сякеры, вілы і кавальскія вырабы для апрацоўкі драўніны.

— Я збіраў старыя экспанаты пераважна ў Нарваўскай гміне. Многа прадметаў прывёз я з Нарвы, Ласінкі, Пухлаў і іншых сёл. Ёсць таксама прылады працы з Кленік ці больш аддаленага Пасталова. Многа драўляных вырабаў людзі ўжо парэзалі і спалілі. Больш захавалася прыладаў з жалеза і вопраткі, якая займае мала месца і таму перахоўвалася ў куфрах, — тлумачыць спадар Міхал. — Хачу яшчэ паставіць у клуні станкі для апрацоўкі ільну і канапель, на якіх можна было б ладзіць майстар-класы па даўніх занятках і паказваць шырэйшай публіцы працу ў мінулым. Аднак для рэалізацыі такой ініцыятывы неабходная падтрымка з боку ўстаноў ці арганізацый. Справа можа нават не ў фінансавай дапамозе, бо я сваімі рукамі магу многа зрабіць, але ў будаўнічых матэрыялах. У мяне ёсць хіба каля дзвюх тысяч экспанатаў і добра было б таксама размясціць іх у больш прасторных памяшканнях, бо тады інакш глядзелі б на іх турысты.

Міхал Фільяновіч разам з жонкай Ганнай і дачкой Марыяй жывуць у вялікім доме, збудаваным у васьмідзесятых гадах. У старэнькай, але адрамантаванай хатцы, у якой раней жылі бацькі, у трох пакоях ёсць месца на начлег для васьмі асоб. Спадар Міхал рамантуючы домік рашыўся захаваць яго стары выгляд, што з'яўляецца дадатковым атракцыёнам для турыстаў. Сам ён выканаў у хатцы ванную і туалет, бо зараз усе турысты патрабуюць такой выгады ў доме. Могуць яны самастойна рыхтаваць сабе харчаванне або заказаць яго ў гаспадароў. Спадар Міхал ездзіць таксама з турыстамі па наваколлі ў якасці праваднікa.

— Прыезджыя цікавяцца нашым наваколлем і я ім расказваю пра мінулае. Я не саромеюся, што з'яўляюся праваслаўным беларусам і гавару з сямейнікамі па-свойму. Некаторыя турысты, захоплены нашай мовай, пачынаюць цікавіцца нашай культурай і рэлігіяй. Мае госці ахвотныя паглядзець старыя цэрквы, могілкі і іншыя гістарычныя аб'екты, — кажа спадар Фільяновіч і ўспамінае сваіх гасцей з розных краін Еўропы і Злучаных Штатаў Амерыкі.

У памятнай кніжцы, у якую ўпісваюцца турысты, можна прачытаць многа пахвальных слоў аб кватэры спадарства Фільяновічаў. Між іншым, дзеля прыезджых спадар Міхал гадуе коз і трусоў.

— Хачу яшчэ купіць карову і каня з брычкай, на якой мог бы я вазіць турыстаў, — гаворыць спадар Міхал і прапануе шукаць больш дэталёвую інфармацыю пра яго кватэру на сайце

www.republika.pl/agro_ruta

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Міхал Фільяновіч паказвае як у мінулым малолі ў жорнах збожжа

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На сцяне музейнага будынка вісіць многа кавальскіх вырабаў

Сем год ГУЛагу

Сонца штораз мацней прыгравае. На душы весялей, ахвота штосьці рабіць, кудысьці бегчы, ехаць, жыць...

Сёння святочная раніца, сонечная і цёплая. Зрываюся раненька з пасцелі, хуценька апранаюся і бягу ў парк: зялёныя дрэвы, шчабятанне птушак, свежае здаровае паветра... На душы робіцца лёгка, радасна, як у маладыя гады бывала. Шпаркім крокам прабягаю знаёмыя сцежкі. Ну, здорава сягоння пашпацыравала, а цяпер трэба пайсці наведаць сястру, якая жыве блізка парку.

Надзя ўжо таксама не спала. Сядзела ва ўтульным фатэлі і раздумвала: чым заняцца, што запланаваць?

— Ведаеш што, — азвалася я, — давай паедзем у Гродна, у госці да сястры Тані. Што на гэта скажаш?

— Неблагая думка прыйшла табе ў галаву. Я ж калісьці часта там бывала. Праўда, едзіла я туды не толькі ў госці, а як усе ў той час — трэба ж было загандляваць, каб мець за што дзяцей вучыць. Варта і сваякоў наведаць, і іншы горад убачыць, — ажывілася Надзя.

Я там была толькі два разы ў дзядзькі Андрэя, майго хроснага бацькі. Затое ён часта з цёткай Нінай і маленькімі ўнучкамі-сіроткамі наведваў сваю родную вёску Войшкі, бацьку Пятра і сястру Тацяну. Гасцяваў і ў брата Максіма ў Плёсках, у нашага бацькі. І нашых дамоў у Беластоку не мінаў...

Паедзем, пабачымся з Таняй і яе сям'ёю, наведаем магілы дзядзькі Андрэя, цёткі Ніны, сястры Веры; запалім свечкі, задумаемся, прыпомнім....

Добрым і вясёлым чалавекам быў наш дзядзька, толькі яго лёс быў вельмі суровы: сем гадоў прасядзеў ён у ГУЛагу за нішто. Праўда, суддзя (без суда) сказаў: трэба было ў лес ісці, не падчыняцца немцам!

— Вось я табе, Ніна, раскажу, як гэта было, — падхапіла Надзя. — Паехала я аднойчы ў Гродна, цэлы тыдзень жыла ў дзядзькі. Аднойчы ішлі мы з ім разам на базар. Праходзіўшы каля невялікага мураванага дома, дзядзька раптам спыніўся і сказаў: «Глядзі, Надзя, вось у гэтым доме ў падвале „сядзеў" я сем дзён пасля арышту. А было гэта так: прыйшлі ноччу ў наш дом, сцягнулі мяне з пасцелі і сказалі „собирайся с нами"! Калі цётка пачала лямантаваць, адказалі: „Завтра вернётся домой, не беспокойся!". Не вяртаўся я сем доўгіх гадоў. Мяне і іншых арыштаваных сабралі і павезлі далёка-далёка — аж на Сахалін. Глянуў я вакол і сэрца замерла: кругом лясы і лясы, снег і невыносны вецер. Тут мне будзе і канец — падумаў я. Уміг жыццё стала вельмі дарагім, як ніколі. Будынкі — драўляныя баракі, як для быдла. У адным з іх зараз жа пачалі нас „судзіць". Выклікалі па прозвішчах. Ужо і мая чарга: „Бручко Андрей Петрович!" Уваходжу, за сталом сядзіць „суддзя" ў фуфайцы і цёплай шапцы-вушанцы, больш ніводнай душы вакол. Не глядзеўшы на мяне сказаў: „25 лет тюрмы, в том 9 лет тяжёлой! Выходить! Следующий!.." А ногі не ішлі. Вось такі быў мой суд.

Пасялілі нас у зімных бараках. Як сялёдкі ў бочцы, нельга павярнуцца было. Спалі мы ў фуфайках і шапках, тулячыся адзін да аднаго, каб узаемна грэцца. Падлогі не было, ноччу трэба пільнавацца, каб не аперціся галавой аб сценку, а то шапка прымерзне. Невыносна кусалі нас вошы. У дзень гналі нас у тайгу, працавалі мы пры вырубцы лесу. Праца цяжкая, мы галодныя, вымучаныя, без сіл.

Фота з архіва сям'і Бручко

Другі злева Андрэй Бручко, побач жонка Ніна і дзве ўнучкі памерлай дачкі Веры (28 гадоў)

Ніхто нас не пільнаваў — вакол лясы, а ў іх поўна дзікіх звяроў, нікуды не ўцячэш, нікуды не дойдзеш, кругом вада. Кожнага дня многа з нас не вярталася, адны паміралі ў лесе, другія ў дарозе. Ішлі мы па тры метры адзін ад аднаго, не бачыўшы адзін аднаго, — калі хто ўпаў, быў яму канец. З голаду пухлі. Слабейшыя не вытрымлівалі, хутка „падалі як мухі". Я быў маладым, моцным фізічна і псіхічна, вытрымаў сем гадоў. Ды толькі дзякуючы помачы нашага доктара. Гэта быў польскі афіцэр, падружылі мы. Захварэў я сухотамі, быў слабенькі. І доктар мяне ратаваў: „Ён сёння не можа ісці на работу, у яго высокая гарачка!" — інфармаваў. І толькі таму астаўся я ў жывых.

Не забуду, як нам абвясцілі аб смерці Сталіна. На дзвярах аднаго з баракаў павесілі кавалак паперы з інфармацыяй аб яго смерці. Калі мы прачыталі, кінуліся з доктарам у абдымкі, доўга качаліся па снезе, плакалі і смяяліся ад радасці, крычалі: „Сталін падох, Сталін падох!.."» — на момант дзядзя Андрэй замоўк, дастаў хустачку з кішэні пінжака і пачаў выціраць слёзы. Я таксама заціхла.

«Неўзабаве, — расказваў ён, — многіх нас, заключаных за нішто, выпусцілі. У лагеры былі і жанчыны. Адна з іх „выходзіла" ў той самы дзень, што і я. Сказала мне: „Куды ты, Андрэй, дзенешся, едзь са мной, будзем разам жыць і сваё гора забываць!" Падумаў я: хаця мы з жонкай разведзены, там жа ж, у Гродне, мая дарагая дачушка Вера! Так хочацца яе ўбачыць, прытуліць... Развод у нас быў абавязковы, трэба ж было затрымаць жонцы дом. Яна была маладая, а я „дастаў" 25 гадоў сталінскай турмы! Я і сам не верыў, што астануся ў жывых і вярнуся дамоў! І ніхто не верыў, адтуль жа людзі не вярталіся. Калі б не смерць Сталіна, я таксама не вытрымаў бы ссылкі! — закончыў свае трагічныя ўспаміны дзядзька. — А цяпер, Надзя, зойдзем у магазін, купім бутэлечку віна і дома вып'ем, лягчэй будзе на душы».

— Праўда, любіў выпіць хросны, ды нельга яго асуджаць, — вярнуўся з ГУЛагу іншым чалавекам, з перажытымі цяжкасцямі, — уключылася я, думаючы ўголас. — Як гэта сталася, што дзядзька выехаў у Савецкі Саюз, чаму? У нас жа тых, хто быў сілай узяты ў дапаможную службу, не асуджалі?

— Дзядзька баяўся, што ў Польшчы будуць іх судзіць, а ў Расіі ніхто пра яго нічога не будзе ведаць. У той час ішла моцная агітацыя на выезд у СССР і нямала людзей выехала з нашых вёсак. Ён паехаў у глыб Расіі, ды голад прымусіў вярнуцца бліжэй польскай граніцы, у Гродна. Многа нашых

Фота з архіва сям'і Бручко

Бацькі дзядзькі Андрэя — Дар'я і Пётр з дачкой Тацянай і ўнукам Лёнем

тут пасялілася, з Плёсак таксама. Праз нейкі час дзядзька купіў дом па вуліцы Ганёндзкай. На няшчасце гэты дом спадабаўся адной жанчыне з „нашых", ды яна не паспела купіць, апярэдзіць нашага дзядзьку. Каб помсціць, данесла на дзядзьку Андрэя гродзенскім „адпаведным уладам".

— Якая подласць! Ён жа нікога не пакрыўдзіў, прымусова служачы ў немцаў. Трымаў і памагаў сваім.

— Так. У час вобыскаў хаваў сваіх людзей, як сам расказваў, спратаную гарэлку ўпіхваў глыбей, а перад немцамі апраўдваў чалавека. Бацька Пятро, каб выратаваць сына, хадзіў па акалічных вёсках і збіраў подпісы на яго нявіннасць; многа людзей падпісалася, ды нічога не памагло, пэўна і не прачыталі...

Вярнуўся дзядзька Андрэй дамоў у Гродна, узяў шлюб са сваёй жонкай, неўзабаве нарадзілася ў іх другая дачка Таня. Зараз жа пасля звальнення забаранілі яму куды-небудзь выязджаць з Гродна. Не мог паехаць і на радзіму, у Польшчу. Не ўбачыў ужо сваёй маці, а нашай бабулі Даркі. Многа слёз яна выліла, чакаючы сына (памерла ў 1957 годзе). Я два месяцы ў 1954 годзе жыла ў дзедкаў, чытала і адпісвала на пісьмы хроснаму (дзед з бабуляй чытаць і пісаць не ўмелі). Сумныя былі гэта лісты. З бацькам, які дажываў у сына ў Плёсках, сустракаўся многа год. На похараны таксама прыехаў. Дзедка жыў доўга, 94 гады.

Добра запамятаўся мне першы прыезд майго хроснага. Усе мы, сёстры, з Беластока з'ехаліся ў бацькоўскую хату. Не помніла я свайго дзядзькі, таму з вялікай цікаўнасцю чакала сустрэчы. Увайшоў у хату, я і адразу яго пазнала — быў вельмі падобны на нашага бацьку. Былі гарачыя прывітанні братоў, слёзы радасці. Бацькі добра прыгатовіліся да сустрэчы дарагога госця. Селі мы ўсе за застаўленым сталом, апавяданням не было канца. Выпілі, павесялелі і давай спяваць. А дзядзька Андрэй, як і наш бацька, мелі добрыя галасы. Запамяталася мне адна сумная песенька, якую мы заспявалі на прывітанне:

На опушке леса
Старый дуб стоял,
А под этим дубом
Партизан лежал...

Потым паплылі і іншыя, вясёлыя песні. Доўга прасядзелі мы за сталом. Я ў падарунку хроснаму прывезла галубовую кашулю, а сама атрымала прыгожую, па-майстэрску зробленую рукамі дзядзькі шкатулу з маім імем і прозвішчам. Яна для мяне дагэтуль вельмі дарагая. Меў дзядзька Андрэй, як кажуць, залатыя рукі. Наш бацька расказваў: «Наш Андрэй таленавіты, прыгожа рысаваў. Зойдзе, бывала, на вячоркі, возьме карандаш і ліст чыстай паперы ды кожнага як жывога нарысуе. Настаўнік казаў дзеду Пятру: „Трэба сына паслаць у мастацкую школу, мае талент"». Ды дзеду патрэбны быў не мастак, а добры гаспадар, Андрэй жа быў наймалодшы ў сям'і. І не глядзеў дзед Пятро, што зусім не цягне Андрэя да гаспадаркі.

— Відаць, шчасце не было яму пісана, — уключылася ў мае развагі сястра. — Пасля ўвальнення працаваў дзядзька ў абутковай фабрыцы, у гарбарні. Работа цяжкая, здароўе слабое. Усё аднаўлялася хвароба лёгкіх, кашмары ГУЛагу вярталіся і ўдзень, і ўначы. Многа курыў, часта, каб забыцца, браў шкляначку віна, хаця дактары забаранілі. Асабістае жыццё не было ўжо такім, як калісьці — нервы, прэтэнзіі. А тут яшчэ наступная трагедыя — памірае маладая дачка Вера, пакідаючы дачушак — сямігадовую Свету і чатырохгадовую Люду, адыходзіць зяць. Яшчэ больш нерваў, слёз. Патрэбны і сілы, і грошы, каб гадаваць маладзенькую яшчэ Таню і дзве малыя ўнучкі. Праз нейкі час памірае цётка Ніна (ёй усяго 57 гадоў), такая патрэбная для дзяцей. Унучкі дарастаюць, выходзяць замуж. Дзядзька Андрэй жыў пры сям'і Тані, цешыўся ўнукамі, ды здароўем сваім не даражыў.

У 1988 г. дзядзька Андрэй памёр, пражыўшы 74 гады. Не раз прыходзіць мне ў галаву думка: колькі гадоў ён, з даўгавечнай сям'і, жыў бы, калі б не трапіў на Сахалін?

І так закончылі мы з Надзяй трагічныя ўспаміны і згодна рашылі абавязкова паехаць летам у Гродна.

Ніна БРУЧКО

Вядома, што чалавечая памяць мае недахоп упрыгожвання таго, што адбывалася калісьці. У гэтым, канешне, нічога дзіўнага няма — не вельмі прыемна людзям толькі і ўспамінаць аб горы і нядолі, якіх часцяком бывала ў гісторыі больш, чым радасных і шчаслівых падзей. Таму і наслойваюцца на гістарычную памяць народа розныя ўяўленні, што стварае тагачаснаму жыццю нават прываблівы выгляд.

Адным з такіх варыянтаў упрыгожвання, але ў той жа час і больш уважлівага вывучэння мінулага, з'яўляецца стварэнне разнастайных ваенна-гістарычных клубаў. У адным з такіх, а дакладней на ягоным сайце, мы пабываем сёння.

Калі цікаўны інтэрнэт-вандроўнік набярэ на сваім камп'ютэры адрас **http://belylis.org**, то перад ягонымі вачыма адкрыецца выяўленне, якое вельмі нагадвае мур нейкага замка. На цёмна-шэрым фоне месцяцца назва клуба — „Белы ліс", таксама ягоны герб, выйсці да рубрык сайта, а таксама фотаздымак, па ўсім відаць, сяброў арганізацыі. Кожны наведвальнік сайта з'яўляецца госцем замка, бо менавіта так называюць сваё віртуальнае прадстаўніцтва яго распрацоўшчыкі.

Больш дэталёва аб „Белым лісе" распавядаецца ў рубрыках „Аб клубе" і „Летапіс клуба". У першай з іх месцяцца праграма і статут арганізацыі, якая лічыць сябе прадаўжальнікам сярэдневяковых рыцарскіх традыцый. У другой мы можам пазнаёміцца з вандроўкамі членаў клуба. Некаторыя з іх даволі неардынарна абазначаныя, напрыклад, „Першы і другі крыжовы паход на Харчычы". На жаль, інфармацыя аб гэтых паходах не змяшчае звестак пра тое, ці перавярнулі ў веру Хрыстову каго-небудзь з жыхароў гэтай вёскі ў Мінскай вобласці „крыжакі" „Белага ліса".

Зразумела, сяброў клуба натхняе не распаўсюджванне ўласнымі сіламі хрысціянства па Беларусі, бо нават у вернасці Богу яны клянуцца пасля вернасці Бацькаўшчыне, што адлюстравана ў статуце арганізацыі. Вабяць іх тыя рыцарскія адносіны і стасункі, якія з цягам часу сталі ўзорам годных паводзін для кожнага чалавека. „Грамадства павінна быць удзячна рыцарству за тое, што яно ўзбагаціла яго новымі паняццямі аб годнасці асобы і гонару, — упэўненыя стваральнікі сайта і сябры арганізацыі. — Рыцар абвык належыць у абароне на самога сябе, толькі на ўласную сілу, толькі на сцены свайго замка. Усюды і заўсёды ён дзейнічаў толькі ад свайго імя. Ён падпарадкоўваўся толькі добраахвотна, па ўласнай феадальнай дамове: яго пэўнасць — вольны дарунак, заклад яго пэўнасці — яго гонар. Кожны рыцар усведамляў недатыкальнасць сваёй асобы і гатовы быў даказваць яе мячом на смяротным паядынку. Вядома, зброя — дрэнны доказ ісціны, але і баязлівасць «вечны нашыйнік рабства». Важна тое, што рыцар не толькі ўсведамляў годнасць сваёй асобы, але і быў гатовы ахвяраваць за гэта жыццём".

У сённяшнім свеце далёка не кожны чалавек здольны прыняць тыя рыцарскія пастулаты, якія прапагандуюць прыхільнікі сярэдневяковых рыцараў. Надта многа змянілася з той пары — сёння не чуваць, каб кагосьці кінулі ў яму на дзесяткі гадоў, распялі на дыбе альбо спалілі на вогнішчы. Дабро і зло цяпер не так яскрава адрозніваюцца адно ад другога, а бляшанае адзенне не заўжды абароніць ад розных непрыемнасцей сучаснай рэчаіснасці. Праўда, можа таму попыт на чалавечыя гонар і годнасць у нашыя часы значна перавышае прапанову.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Рэнесанс праз дванаццаць гадоў

Своеасаблівы рэнесанс перажывае гандбольная беларуская дружына. Каманда пад кіраваннем легендарных Спартака Мірановіча і Аляксандра Каршакевіча пераадолела бар'ер у выглядзе зборнай Швейцарыі і заваявала месца ў фінальнай стадыі чэмпіянату Еўропы, дзе збяруцца 16 мацнейшых кантынентальных прадстаўнікоў. Сем краін атрымалі фінальныя пуцёўкі без усялякага адбору — Францыя (чэмпіён Еўропы 2006), Нарвегія (гаспадыня турніру), а таксама яшчэ пяць лепшых па выніках мінулага першынства — Іспанія, Данія, Харватыя, Нямеччына і Расія. Яшчэ дзевяць зборных высвятлялі шчасліўчыкаў у мясарубцы накаўт-раўнда.

Шлях у эліту беларуская каманда пачынала ў студзені, калі ў кваліфікацыйным турніры адолела Малдову, Кіпр і Славаччыну. Са швейцарцамі, якіх цяпер трэніруе сербскі спецыяліст Драган Джукіч, у нашых быў адмоўны баланс сустрэч. Сем гадоў таму прадстаўнікі краіны самых дакладных гадзіннікаў перайшлі нам дарогу да фіналу чэмпіянату свету. Прыемна, што зараз удаўся рэванш.

Перад накаўт-раўндам здарылася маленькая сенсацыя. Адзін з нашых перспектыўных майстроў Сяргей Гарбок перадумаў прымаць расійскае грамадзянства і вярнуўся выступаць за родную краіну. Паўсярэдні па амплуа Гарбок гуляе цяпер у бундэслізе за „Кронаў", з другога нямецкага дывізіёну прыехаў таксама галкіпер Віталь Фешчанка, які даўно не гуляў за галоўную каманду краіны. З іншых легіянераў назавем крайняга Івана Броўку (Германія), Аляксея Усіка (Швейцарыя), Сяргея Убажэнку (Аўстрыя), астатнія гульцы зборнай выступаюць за брэсцкі БГК імя Мяшкова, мінскія СКА і Універсітэт фізічнай культуры.

У першым матчы, які адбыўся ў Брэсце, беларусы дасягнулі вельмі важкай перавагі ў 9 мячоў — 33:24. Вельмі добра згуляла абарона і ў першую чаргу брамнік Фешчанка. А найбольш выніковымі ў атацы сталі Броўка — 7 галоў, Убажэнка і Аляксей Васільеў — па 4.

Цягам другога паядынку нашы саступалі шэсць мячоў, але здолелі пераламаць тэндэнцыю і параўняць сітуацыю. Так што нервовай канцоўкі не было. У выніку беларусы саступілі 28:30, але дамагліся агульнай вікторыі. Найбольш вызначыліся ў Швейцарыі Юрый Грамыка, Убажэнка, Гарбок — па 5 закінутых галоў, Броўка — 4. А галоўнае, што падначаленыя Мірановіча выявілі камандную волю.

Апошні раз беларуская гандбольная дружына выступала на чэмпіянаце Еўропы ў 1994 годзе ў Партугаліі, дзе заняла восьмае месца сярод 12 удзельнікаў. Зараз у фінальнай стадыі, якая пройдзе ў Нарвегіі з 17 па 27 студзеня наступнага года, выступіць 16 мацнейшых зборных. Патэнцыйнымі супернікамі беларусаў, акрамя пералічаных вышэй краін, могуць стаць Польшча, Венгрыя, Славаччына, Славенія, Чэхія, Чарнагорыя, Швецыя і Ісландыя. Асабліва вылучым поспеху чарнагорцаў, якія ў змаганні за фінал адолелі партугальцаў.

На жаль, беларускія гандбалісткі не змаглі паўтарыць поспех мужчын. У аналагічнай кваліфікацыі да чэмпіянату свету ў змаганні з Македоніяй нашым дзяўчатам забракла аднаго закінутага мяча. Прычынай прыкрай агульнай паразы стаў першы матч, дзе выхаванкі Канстанціна Шараварава прайгралі 21:26. Дома адыграцца не ўдалося — перамога толькі 25:21. Вось такі крыўдны зыход для беларускіх дзяўчат.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Канферэнцыя ў Комплексе спецыяльных школ у Гайнаўцы

З 1 да 3 чэрвеня 2007 г. у Комплексе спецыяльных школ у Гайнаўцы адбылася першая частка праекта „Шматпрофільнае ўдасканальванне дзіцяці метадам пастаяннага стымулявання". Згаданы праект фінансуецца Польска-амерыканскім фондам свабоды ў рамках Праграмы перамен у рэгіёне (RITA), які выконваецца Фондам адукацыі для дэмакратыі. Галоўная мэта праекта — азнаямленне з наватарскімі метадамі шматпрофільнага інтэлектуальнага і маторнага ўдасканальвання дзіцяці з пашкоджаннем галаўнога мозгу на аснове філадэльфійскай методыкі Глена Домана, а таксама новых метадаў дыягнаставання алкагольнага сіндрома плода (АСП).

Канферэнцыя пачалася з мастацкай часткі ў выкананні вучняў мясцовага Комплексу спецыяльных школ. Дзеці выступілі з пастаноўкамі „Золатавалосая" і „Вясёлая школа", дэкламавалі вершы, а ўдзельнікі вакальна-танцавальнага калектыву „Карэкта" паказалі свае харэаграфічныя ўмеласці.

З дакладамі выступілі і майстар-класы вялі Кшыштаф Лішч і Катажына Каламайская-Лішч — спецыялісты Фонду ў карысць развіцця інвалідных дзяцей „Дай шанс" і Тэрапеўтычнага інстытута ў Торуні.

У канферэнцыі ўдзельнічалі настаўнікі Дапаможнай школы-інтэрната з вёскі Бучамля і Цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі з Камянца на Беларусі, прадстаўнікі асветных устаноў, якія працуюць з інваліднымі дзяцьмі на тэрыторыі Гайнаўскага павета і супрацоўнічаюць з Комлексам спецыяльных школ, прадстаўнікі прыёмных сем'яў ды бацькі дзяцей-інвалідаў. Сваімі ведамі і вопытам у галіне АСП і яго ўплыву на развіццё дзіцяці падзялілася з сабранымі ардынатар радзільнага аддзялення Гайнаўскай бальніцы Рэната Вашчук. Удзельнікі канферэнцыі азнаёміліся з многімі цікавымі праблемамі, веданне якіх неабходнае ў штодзённай працы з дзеткамі-інвалідамі, а таксама падзяліліся сваім жыццёвым і прафесійным вопытам.

Канферэнцыя завяршылася мультымедыйнай прэзентацыяй дзейнасці Камянецкага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, падрыхтаванай дырэктаркай гэтай установы. На трэці дзень беларускія партнёры праекта ўдзельнічалі ў гала-канцэрце Міжнароднага конкурсу дзіцячай і маладзёжнай песні „Ноты дружбы" ў Гайнаўскім доме культуры, у якім выступілі гурты і салісты з Беларусі, Польшчы і Украіны, у тым ліку калектыў глуханямых танцораў „Надзея" з Уладзіміра-Валынскага.

У кастрычніку настаўнікі Комплексу спецыяльных школ ды спецыялісты Фонду „Дай шанс" Кшыштаф Лішч і Катажына Каламайская-Лішч наведаюць Беларусь, дзе ў Камянецкім цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі адбудзецца другая частка праекта — канферэнцыя для бацькоў дзяцей-інвалідаў і настаўнікаў-алігафрэнапедагогаў, якія працуюць у шасці спецыяльных школах Брэсцкай вобласці.

Люцына ВАЎРАШУК
каардынатар праекта

„У мяне статычны погляд на рух”

— размова са стылістам Славамірам БЛЯШЭЎСКІМ.

Жывём штодзённа сваімі праблемамі, часам адрываемся ад іх, сядаючы перад тэлевізарам або заглядаючы ў каляровы часопіс. Адным здаецца, што гэта адзіны сапраўдны свет, другія адмаўляюць яму права на называнне яго рэчаіснасцю. Спадзяюся, што часткова на гэтыя хібы адкажа Славамір Бляшэўскі, з якім я гутарыла пра жыццё ў свеце іміджмейкерства, у якім займае ён ужо моцнае месца. Яго бацькаўшчынай у пэўным сэнсе з'яўляецца Сопат, хаця прасочваюцца ў ім рысы касмапаліта. Аднак шмат гадоў ужо жыве ён у Варшаве, бо ж гэта цэнтр шоу-бізнесу ў Польшчы і самае лепшае месца працы для стыліста.

Фота Ілоны КАПРЮК

Ілона Карпюк: — *Чым можна займацца ў Тваёй прафесіі?*

Славамір Бляшэўскі: — Я люблю крайнасці. Калісь я год працаваў у часопісе „Elle” журналістам моды, але хутка стаў адчуваць, што гэта мяне абмяжоўвае, укідае ў акрэсленую шуфляду, таму цяпер пайшоў я іншай дарогай. З'яўляюся я іміджмейкерам — кансультантам бізнесменаў, палітыкаў, зорак польскай эстрады па выглядзе і мове рухаў цела. Працую ў рэкламе і масмедыях.

— Што цяпер займае Цябе найбольш інтэнсіўна?

— Яшчэ нядаўна займаўся я стваранням іміджу журналістаў інфармацыйнага агенцтва ў публічным тэлебачанні, але ўправа змянілася і, здаецца, цяпер гэтым сур'ёзна ніхто не займаецца, а я сам звязаўся з тэлеканалам TVN. У галоўным займаюся вядучымі праграму „Цяпер мы” („Teraz My”), а таксама супольна з Шыманам Маеўскім фарміруем ягоны імідж у праграме „Шыман Маеўскі шоу”.

— Цяжка працуецца з так вядомымі асобамі?

— Гэта ў пэўным сэнсе справа даверу. Для прыкладу, з Шыманам у мяне вельмі добры кантакт, ён шануе мяне, маю працу і часта зразу прымае мае прапановы, без ніякіх засцярог. Мая праца гэта распаўсюджванне трэндаў або фарміравание іміджу. У выпадку Шымана свабодна спалучаю гэтыя справы, прыкладна камізэлькі, інспіраваныя вуліцай, а пабачыў я тое ў Нью-Йорку.

— Дзе ў Польшчы можна сустрэцца з гэтымі плынямі?

— Перш за ўсё трэба быць крытычным і такім жа вокам глядзець на прапановы ў Польшчы. Не хачу я быць крывадушнікам, таму не скажу, каб не заглядаць у польскія журналы мод. Сам карыстаюся замежнымі, але ведаю, што спраўнае вока хутка вылаўлівае цікавыя рэчы. Няхай гэта будзе адна рэч у цэлым часопісе, але гэта ўжо поспех.

— Што можна лічыць модным?

— Адказ мусіць быць складаным, таму што стыліст павінен быць аб'ектыўным. Крэатар моды мае абсалютна суб'ектыўны погляд. Мы ў працы патрабуем аб'ектыўнасці. Яна не заключаецца на адборы таго, што моднае, а таго, што патрэбнае і адпавядае канкрэтнай асобе. Варта помніць, што стылёвы неабавязкова мусіць быць модным.

— Як ставіш дыягназ што пасуе?

— Гэта напэўна нялёгкая справа. Трэба ведаць дзеля чаго патрэбны змены, навошта, аглядаю розныя каталогі, правяраю стыль жыцця асобы. Бывае, што часам тэлефануе нейкае выдавецтва з просьбай пра дапамогу. Проста бывае, што выгляд зусім не адпавядае музыцы. Люблю такія задачы, тым болей што калісь я таксама займаўся музычным бізнесам, працуючы менеджэрам гурту „Аптэка”.

— У Цябе ёсць любімыя крэатары?

— Так, ёсць, мяне ўвогуле вельмі цікавіць элегантны стыль. У гэтай галіне падабаюцца мне прапановы Ральфа Лорана, з другога боку стыль вуліцы і тут я з'яўляюся прыхільнікам DSquared2 (Діскуэрт).

— Ці адчуваеш розніцу ў працы з жанчынамі ды мужчынамі?

— У такой працы жаночы элемент неабходны! Таму часта сустракаюся з меркаваннямі, што стыліст найхутчэй з'яўляецца жанчынай або гомасексуальным мужчынам. Я не прыналежу да гэтых груп, але жаночы элемент напэўна ёсць. Іншая справа з другога боку, калі працуеш над людзьмі. Люблю стылізаваць мужчын, асабліва элегантна, бо сапраўды вялікую прыемнасць дае мне папаўнянне шафы бізнесмена, але ў жанчын раскрыць можна намнога больш.

— Ці можна акрэсліць Твой своеасаблівы стыль?

— Думаю, што так. Перад усім люблю пераломваць формы, часта спалучаю элементы класічных стыляў у адно. Паяўляюцца, зразумела, таксама рысы сусветных вуліц.

— Якія рысы характару прыдаюцца ў Тваёй працы?

— Пераймаюся тым, чым якраз займаюся і заўсёды працу канчаю, тады напэўна неабходная паслядоўнасць. Наогул бываю рашучым, але, здаецца, гэта нікому не перашкаджае, бо і я стараюся ставіцца да людзей з сімпатыяй, зразуменнем. Не адзін раз здаралася мне працягваць працу іншых і вынікі заўсёды былі пазітыўныя.

— Што рашае пры выбары новага супрацоўніцтва?

— Думаю, што ўзровень выкліку. Калісь найбольш прыемныя былі фатаграфічныя сесіі, але цяпер найбольш цешуся, калі бачу задаволенага сваім выглядам чалавека. Сёння аднак тыя, якія карыстаюцца дапамогай стыліста, часта ведаюць хто чым характэрны. Такім чынам ведаюць, якія плыні я прэзентую і чаго можна спадзявацца, таму наогул не атрымоўваю тэлефонаў, з якіх нічога не вынікае. Няскромна магу сказаць, што маё прозвішча гэта ўжо марка.

— Што Цябе захапляе ў жыцці?

— Любоў, жыццё з людзьмі, якім я патрэбны і якія мне блізкія. З другога боку — пазнаванне людзей праз іншыя культуры, падглядванне свету. Часта здымаю на стужку акружаючы свет, аглядаю пазней усё гэтае з сябрамі. У мяне такі дакументальны падыход да наваколля.

— Гэта захапленне людзьмі?

— Напэўна так, хаця на маіх здымках і фільмах хутчэй пабачыш месцы, але маюць яны сэнс толькі ў кантэксце людзей, якія там жывуць або проста паяўляюцца.

— Лічыш сябе мастаком?

— Мастацтву вучаць у мастацкіх школах, а сярод спецыяльнасцей ёсць і стылізацыя, таму ў гэтай прафесіі можна быць і мастаком. Думаю, што мая праца гэта мастацтва.

— Якім Ты з'яўляешся мастаком?

— Я — непакорная душа. Люблю разнароднасць, але знаходжу таксама месца класіцы. Таму і найбольш цаню майстроў з падобным падыходам (сярод іх Майлс Дэйвіс, Мікеланджэла Антаніоні, Фёдар Дастаеўскі) ці карціны дадаістаў. Гэта мой творчы краявід.

— Дзякую за размову.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

2 ☞ працяг

Якую параду можна даць, каб не паддацца хвалі варожасці, насілля? Хоць бы для таго, каб пасярод папялішчаў мінулага знайсці той дыямент з верша Цыпрыяна Каміля Норвіда ці прыўкрасу, аб якой мроіла філосаф Ганна Арэндт, знайсці каштоўную думку, паддадзеную крытычнаму аналізу, перадаць яе быццам зніч, нязгасны агмень новым, наступным пасля нас пакаленням. Тыповая для посткамуністычных краін разборка над найноўшай гісторыяй з'яўляецца, на жаль, спробай знайсці „праўду”, якая мае павіснуць над палітычнымі праціўнікамі і зніштожыць іх, а не мае што-небудзь высветліць ці даказаць. Гэта не працяглае даходжванне да ўмацавання свайго месца ў жыцці-быцці.

Бывае таксама часта так, што з'ява культуры прамінае, трапляе ў бяспамяць, хоць не паспела выкрышталізавацца ва ўсіх сваіх праявах і моцы, не дасягне паўнаты. Такой плынню ў культуры ёсць хоць бы дваццацівечны экзістэнцыялізм, які асацыюецца з прозвішчамі такіх творцаў як Марцін Гейдэгер ці Жан-Поль Сартр. Гэтая плынь была спробай апісання, акрэслення чалавечага лёсу, а таксама заданняў для выканання, якія стаяць перад кожным з нас у сутыку з нэндзнай цялеснасцю, але таксама з грамадой, у якой прыйшлося нам жыць, з рэальнасцю, з глебай, з небам, з космасам. Вось дасягненні Гейдэгера, таксама дыскусійна прынятыя моднымі мысляра мі постмадэрнізму. Вось забыты, абсмейваны Сартр, а ж варта прыгадаць з ветлівай увагай яго раман „Млоснасць” або том расказаў „Мур”.

Ці правініліся ў гэтым самі творцы, што пакінулі (?) прадмет доследаў, каб выбраць пачын, той няшчасны саўдзел, як Гейдэгер у шэрагах гітлераўцаў, ці Сартр у гурце марксістаў, а нават маістаў? Выбралі яны паспешліва, паказалі нецярплівасць. Ці іх жыццёвыя выбары, іх мітусня ў штодзённасці, іх памылкі вырашылі аб гэтым, што шлях экзістэнцыялізму наступныя пакаленні адкінулі з пагардай? Ці толькі тыя выбары, ці таксама наша зменлівая, капрызная часапрастора, якая кіруе намі, уплывае на нашы лёсы ў спосаб для нас непрыкметны? Мне мроіцца, што якісьці малады, адважны мысляр ухопіцца за сарваную нітку экзістэнцыяльнай рэфлексіі; што пакіне пасля сябе кнігі, да якіх пацягнецца нецярплівы чытач. Каб знайсці супакой. Каб не даць паглынуць сябе нечалавечным тэндэнцыям, каб не забыць, дзе яго месца пад сонцам.

Ежы ПЛЮТОВІЧ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 001 egz.

Суседскія былі

СВАЯЦКІЯ РАЗБОРКІ

— А каб ты здох, паскуда! — пачаў дзень з гэтай фразы Вацюк Ляшкоўскі, як убачыў каля сабачай буды абарваны ланцуг, які бездапаможна звісаючы з крука сведчыў пра тое, што начны ахоўнік Вацюковай гаспадаркі з другой паловай ланцуга зляцеў недзе на вёску чужых курэй паганяць, ці яшчэ якую мясцовую хатнюю жывёлу панерваваць сваім брэхам. А мо пашукаць сабе пару надумаўся. Тузік, так клікалі сабаку, толькі тыя дзве забавы і ведаў. І, вырваўшыся на волю, заўсёды стараўся скарыстаць іх на ўсе сто адсоткаў. — Во дзе брыда, во дзе падла, — працягваў лямантаваць Ляшкоўскі. — Ланцугоў на цябе не напасешся. Злаўлю, то задушу падлу сваімі рукамі.

Вацюк гучна вымавіў яшчэ парутройку фразаў нелітаратурнага зместу, перакінуў праз плячо касу і пасунуўся ў поле. Але толькі глянуў на свой агарод, як тыя фразы, якімі толькі што завяршыў сваю думку зноў здрыганулі паветра. У бураках, заблытаўшыся ланцугом за яблыню стаяла чужая цялушка і спрабавала на смак малады бурачнік.

— Што за людзі! — не супакойваўся касец, перайшоўшы на больш лагодныя словы. — Калі яны за сваёй жывёлай глядзець ужо будуць?! Гэтая ж скаціна мне ўсе буракі ўжо вытаптала. Заб'ю брыду, хай тады наракаюць на сябе. Ці я садзіў буракі, каб чужых цялушак падкормліваць? А ну пайшла брыда адгэтуль!

Але каманда падзейнічала на цялушку адваротна жаданням чалавека. Тая, напалохаўшыся, стала скакаць па агародзе як дрэсіраваны конь па цырку, яшчэ больш змясіўшы ўсё, што траплялася пад капыты. А заблытаны ланцуг паздзіраў усю кару з любімай яблыні Ляшкоўскага.

— Ну то зараз табе дакладна капец! — зароў той і, раз'юшыўшыся да апошняй ступені трывання нерву, хапіў палку і стаў мясіць няшчасную жывёліну.

Як доўга ён здзекаваўся б над ёй — невядома. Са стану шаленства яго вывеў чалавечы вокліч.

— Жывыя ў хаце ёсць? — данеслася да Вацюка з падворка.

Кінуўшы палку як мага далей, Ляшкоўскі паспяшаўся адляцецца ад пабітай цялушкі, каб суседзі, убачыўшы такія неўраўнаважаныя дзеянні, не абвінавацілі яго ў садызме.

— А, кум! — накінуўшы на твар выраз звышласкавасці выгукнуў ён, убачыўшы на падворку Аркашку Крупу, свайго сваяка. — Добры дзень! Якая сёння цудоўная раніца, праўда. Сонейка ласкавае, спякоты няма. Вось надумаўся пайсці пакасіць. Добра што ты зайшоў. Памятаеш, прасіў я ў цябе пазычыць грошы на парсючкоў. Можа прынёс?

— Не хвалюйся, кум, — адказаў той махнуўшы рукой. — Пазычу. Ды і грошы там якія. Дробязь. Ты ж парсючкоў у Мішкі Гулякі бярэш. Ён жа табе радня па жонцы. Прадасць танна. Амаль за дарма. Вечарам зайдзі да маёй Зінкі. Яна дасць. А я цялушку сваю шукаю. Сарвалася з ланцуга і недзе прапала. Не бачыў?

— Як не бачыў. Бачыў канешне, — Вацюк выцер з ілба халодны пот. — Стаіць у мяне ў агародзе. Заблыталася бедная ланцугом за яблыню і не можа даць сабе рады. Я хацеў адвязаць, то не даецца. Напалоханая нечага. Нехта, бедную, добра пабіў. А мне яе так шкода стала, так шкада, аж сэрца забалела. Во толькі што хацеў вады ёй прынесці, каб супакоілася. Ведаеш, кум, людзі зараз горшыя за звяроў. Пабілі жывёліну ні за што. Нават кроў з носа пайшла. І хто яе так? Чым жа гэтая нявінная жывёліна некаму не дагадзіла?

— Ты мне лухту не вярзі, — спахмурнеў Аркашка. — Я чуў як ты там равеш і некага сцябаеш. Толькі не ведаў каго. А гэта мая цялушка аказваецца. Во табе, а не грошы, — і ён падсунуў пад нос куму вялікую дулю.

— А ты чаго за сваёй жывёлай не глядзіш? — агрызнуўся Ляшкоўскі. — Яна мне ўвесь агарод вытаптала. Зараз і табе будзе як ёй. А грошы свае ў дупу засунь. Мне Гуляка парсючкоў і так дасць. Ён мне як-ніяк радня добрая. Не тое, што ты, сквапняга, які за сваёй гаспадаркай прыглядзіць не ў стане.

— Не, гэта табе будзе зараз так, як маёй цялушцы, — не вытрымаў Крупа і з размаху да Вацюковага носа яшчэ раз падсунуў руку, толькі ўжо не з дуляй, а з вялікім як конская галава кулаком.

Праз некалькі хвілінаў кумы, качаючыся па падворку, ужо добра мясілі адзін другога, суправаджаючы удары страшнымі праклёнамі і яшчэ больш жахлівымі пагрозамі. Можа пазабіваліся б, каб не бабка Верка, якая акурат у гэты час праходзіла побач.

— Што вы робіце, — залямантавала яна. — Ратуйце, людцы. Мужыкі пазабіваюцца. Гвалт! Ратуйце!

— А чаго ён сваю цялушку ў мяне на агародзе наважаў? — стаў апраўдвацца раззлаваны Вацюк.

— Якую цялушку, дурні? — заківала галавой бабка Верка. — Яго цялушку Зоська ўжо знайшла і дахаты завяла. Гэта твой сабака напаў на цялят, то яны і пазрываліся з ланцугоў. Разляцеліся куды якая.

— То гэта не кумава цялушка? — падняўся на ногі Ляшкоўскі. — А чыя тады гэта паскудная скаціна, з-за якой сваякі ні за што пабіліся?

Бабка Верка зайшла за вугал, паглядзела на пабітую жывёлу і пляснула ў далоні.

— Дык гэта ж цялушка Мішкі Гулякі, сваяка тваёй жонкі, у якога ты парсючкоў узяць хочаш.

Вацюк узяў касу, зноў перакінуў яе праз плячо і, ні слова больш не сказаўшы суседзям, пацягнуўся ў поле.

— Каб ён здох, той сабака, — каторы раз пачаў ён гаворку сам з сабой і з тае самае тэмы, з якой пачаў дзень. — Павешаю на тым кавалку ланцуга, паскуду, які ў яго застаўся на яго паганым карку.

І зноў, перайшоўшы на нелітаратурную фразеалогію, знік за гарой.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. вакальна-інструментальны ансамбль Уладзіміра Мулявіна, 2. сталіца Эквадора, 3. антыльская дзяржава са сталіцай у Брыджтауне, 4. апорная будаўнічая калона ў выглядзе жаночай фігуры, 5. мільярдная частка тоны, 6. кантынент з Камчаткай.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — фраза.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 20 нумара

Амнезія, ком, ніз, піск, чэх, шчаўе, шыба.

Рашэнне: **Ехаўшы бачком ні з кім не зачэпішся.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

24.06 – 30.06

Баран (22.03. — 20.04.) Можаш далёка зайсці пры нагодзе трансфармуючага Плутона! Карыстайся нагодай, можа табе шмат чаго дастацца. Вельмі добры тыдзень у фінансах. Шмат мілых людзей, хоць не ад усіх чакай падтрымкі.

Бык (21.04. — 21.05.) Можаш быць расчараваны, не ўсе цябе зразумеюць, могуць падвесці сябры. Пустыя надзеі. Затое ў фінансах з горачкі; могуць дастацца табе неспадзяваныя грошы, кампенсацыя.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Некаторыя справы пачнуць замаруджвацца. Цяжка запанаваць над дэталямі, нялёгкія выбары. Партнёр натхніць цябе на новыя дзеянні. Будуць асобы, з якімі пагаворыш ад сэрца. Дробныя скрыгаты ў фінансах і ў здароўі.

Рак (23.06. — 23.07.) Будзеш старацца, аформіш усе справы, асабліва з паперамі і валакітай. Дагаворышся з людзьмі. Кашальком апякуецца Венера! Затое крайнія настроі ў пары, фанабэрыі.

Леў (24.07. — 23.08.) Усё добра, ды турбуюць цябе сумненні, будзеш менш адважны і баявіты, чым у папярэдніх тыднях. Адчуеш, што цябе кахаюць. Ды не заружова з фінансамі (на выдаткі ўдасца ўсё ж сабраць адпаведную суму). Сур'ёзны і пазітыўны пералом у жыцці.

Дзева (24.08. — 23.09.) Ажыўленне, самаўпэўненасць. У час бяды падмога невядома адкуль. Ды могуць паявіцца скрыгаты — хтосьці не так зразумее твае намеры. Зваліцца табе на галаву шмат квіткоў і выдаткаў, цяжка будзе ўсё ўзяць у руку. На ўсякі выпадак схадзі да лекара, пракантралюй здароўе.

Шалі (24.09. — 23.10.) Будзеш шукаць моцных і рашучых — толькі пры такіх асобах жвавей заб'ецца тваё сэрца. Можаш падумаць аб самастойнай дзейнасці. Цяжкія перапалкі ў каханні з былымі і новымі. Добры час пагасіць даўгі.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Лепш кудысьці з'едзь, з каханай асобай, з сям'ёй. Ды калі адтэрмінуеш свой водпуск, шэф гляне прыхільнейшым вокам на цябе ды даручыць вельмі важнае заданне (пры нагодзе спячэш і свой пірог). Можа турбаваць цябе здароўе бацькоў ці дзядоў. Можаш сустрэць братнюю душу. Еж парасткі, зерне і арэхі.

Стралец (23.11. — 22.12.) Ты цяпер інспірацыя для іншых, можаш таксама атрымаць цікавую прапанову — бяры без аглядкі, такая нагода паявіцца няхутка! Асабліва калі яна датычыць былых незавершаных спраў. Бярыся за працу! Ды будзь вельмі асцярожны з машынамі і вострымі прадметамі.

Казярог (23.12. — 20.01.) Можаш адчуваць, што правальваецца табе грунт пад нагамі. Не бярыся за ніякія няпэўныя інвестыцыі, крэдыты, пазыкі, нават калі б мелі гэта быць залатыя горы. Дарэчы, найбольш ахвоты ў цябе адно да амураў (асаблівы росквіт у старых пар!). Не цягайся па шынках, пашукай лепш знаёмстваў у Інтэрнэце.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Неабходнасць паправіць памылкі, пачуццё застою, спазненні. Можаш сам напароцца на ражон. Бярыся за рамонт ці мыццё акон. На працы адны поспехі і мілая атмасфера.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Могуць цябе турбаваць уласныя боязі і фобіі. Лёгка цябе цяпер можна зманіпуляваць, цяжка з трапнай ацэнкай людзей. 28-30.06. лёгка можаш трапіць у сіло кахання; новыя знаёмствы і сувязі, наладжаныя ў гэтыя дні, будуць нетрывалыя. Час роздумаў, медытацыі, малітвы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960